

ЯК СВЯТКУЮЦЬ НОВЫ ГОД У АРМІІ

5

БЕЛАРУСКАЕ КІНО: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

12-13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 СНЕЖНЯ 2022 г. СУБОТА № 248 (29870)

КОРАТКА

• Пасажыраабарот у Беларусі ў студзені — лістападзе вырас на 3,1 працэнта.

• Фінал рэспубліканскага прававога турніру «Сіла закона» адбудзецца ў Мінску 21 снежня.

• Інфацэнтр для бежанцаў адкрылі каля аўтадарожнага пункта пропуску «Брэст».

ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў:**

*«Практычна штодня дэпутаты разам з памочнікамі праводзяць у выбарчых акругах маніторынг цэн на харчовыя і нехарчовыя тавары, адсочваюць наяўнасць запатрабаваных прадуктаў у гандлёвай сетцы. Пытанне гэтае вельмі важнае, паколькі ад таго, колькі сярэднестатыстычны грамадзянін, сям'я траціць грошай на прадукты харчавання, неабходныя ў быце рэчы, залежыць узровень дабрабыту насельніцтва. Няўхільнае выкананне ўсімі зацікаўленымі структурамі даручэння Прэзідэнта аб недапушчэнні росту цэн, забеспячэнні грамадзян даступнымі, якаснымі, разнастайнымі і ў першую чаргу айчыннымі прадуктамі і таварамі стварае сацыяльна-эканамічную стабільнасць унутры краіны, дае цвёрдую ўпэўненасць жыхарам у заўтрашнім дні і ўзмацняе давер насельніцтва да ўлады».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МЫ ПАВІННЫ ЗАЎСЁДЫ ЗЫХОДЗІЦЬ З ТАГО, ШТО МЫ — ДЗЯРЖАВА СУВЕРЭННАЯ І НЕЗАЛЕЖНАЯ»

### Аб чым гаварыў наш Прэзідэнт напярэдадні візіту ў Мінск Уладзіміра Пуціна

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную развіццю беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Удзел у нарадзе прынялі прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр Вальфовіч, першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў і віцэ-прэм'ер Пётр Пархомчык. Таксама сярод удзельнікаў нарады — кіраўнікі ведамстваў і арганізацый, адказных за асноўныя напрамкі беларуска-расійскага супрацоўніцтва.**



Фота БелТА.

## АД ТАКТЫКІ ДА СТРАТЭГІІ

У наступны панядзелак, 19 снежня, у Палацы Незалежнасці адбудуцца беларуска-расійскія перагаворы на найвышэйшым узроўні. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што галоўная тэма — эканоміка.

«У любога з вас можа ўзнікнуць пытанне, што мы занадта часта сустракаемся з Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі, абмяркоўваем актуальныя праблемы», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка і патлумачыў, чым гэтыя перагаворы будуць адрознівацца ад папярэдніх. «Адрозненне простае. Раней, сустракаючыся з Прэзідэнтам Расіі, кіраўніцтвам Расіі, асобнымі міністрамі, мы абмяркоўвалі пытанні тактычнага характару. Ад гэтага нікуды не падзецца, паколькі супраць Расіі і Беларусі былі ўведзены страшныя санкцыі. Супраць Расіі ажно 900.... Ну і супраць нас заадно, каб праз нас, як яны гавораць, Расія не магла абысці гэтыя санкцыі. Таму нам прыйшлося на працягу года сустракацца і рэагаваць на тую сітуацыю, якая склалася ў выніку ціску на нас калектыўнага Захаду. Гэта былі пытанні бягучага, тактычнага ў асноўным, характару. Хоць, шчыра кажучы, на кожнай сустрэчы праз гэтыя пытанні мы спрабавалі зазірнуць у будучыню. На гэтай сустрэчы мы абмяркуем пытанні стратэгічнага характару. Пытанні стратэгіі найперш у сферы эканомікі». Прэзідэнт адзначыў, што будуць абмеркаваны і ваенна-палітычная сітуацыя вакол абедзвюх краін, пытанні ваенна-прамысловага комплексу, абараназдольнасць і бяспека Беларусі і Расіі. Але галоўнае — гэта эканоміка.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, другая асаблівасць будучых перагавораў звязана з рэалізацыяй дваццаці васьмі саюзных праграм, якія вызначаюць асноўныя напрамкі беларуска-расійскага супрацоўніцтва. «Як мне дакладваюць, рэалізавана пад 60 працэнтаў гэтых праграм. Надрэнныя тэмпы. Але, рэалізоўваючы тыя ці іншыя праграмы, нашы ўрады сутыкнуліся з пытаннямі, якія яны вырашыць не могуць. Не таму, што яны дрэнныя спецыялісты, а таму, што гэта пытанні прэзідэнтаў», — патлумачыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, пасля няўдалага мяцяжу ў Беларусі ў адносінах дзвюх краін пачаўся асаблівы перыяд, які пацвердзіў правільнасць беларускага курсу на збліжэнне з Расіяй і своечасовасць пакета інтэграцыйных дакументаў у рамках Саюзнай дзяржавы.

СТАР. 2

Спажывец

# Адпачынак, канферэнцыя і начлег... на запраўцы

### Што прапануе сучасны прыдарожны сэрвіс

**Сучасны адпачынак на дарозе павінен быць зручным, бяспечным і якасным для розных катэгорый падарожнікаў: дарослых, дзяцей і жывёл, таму прыдарожны сэрвіс развіваецца адпаведна з пажаданнямі наведвальнікаў, сцвярджаюць спецыялісты транспартнай галіны. Яны расказалі, што могуць атрымаць вандроўнікі на аб'ектах уздоўж трас краіны.**

## Зручна для спажыўца і інвестара

Патрабаванні па размяшчэнні аб'ектаў і іх архітэктурным напаўненні вызначаюцца шэрагам дакументаў. У прыватнасці, была прынятая Генеральная схема развіцця прыдарожнага сэрвісу на рэспубліканскіх дарогах на 2021—2025 гады.




СТАР. 3

Перадсвяточнае

# НАВАГОДНЯЯ АРЫФМЕТЫКА

### Больш чым два мільёны падарункаў, амаль 540 кірмашоў і ёлкі ў кадках

**Акрамя традыцыйных святочных мерапрыемстваў і распродажаў, на пачатак снежня прадоўжана работа 182 гандлёвых аб'ектаў і 111 аб'ектаў грамадскага харчавання. У нашай краіне на перыяд правядзення калядных і навагодніх свят запланавана 539 кірмашоў. У Мінску і вобласці яны пачнуцца з 17 снежня. У некаторых рэгіёнах ужо пачаліся, а па выніках двух тыдняў снежня 15 кірмашоў ужо прайшло, паведаміла на прэс-канферэнцыі начальнік упраўлення гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі Наталля МЕЛЬНІКАВА.**

## САЛОДКІЯ ПАДАРУНКІ — ДА 55 РУБЛЁЎ

Начальнік упраўлення адзначыла, што менавіта з 17 снежня ў рэгіёнах і сталіцы пачнуць работу 1100 ёлачных кірмашоў. Цана ёлак у залежнасці ад рэгіёна і вышыні дрэва будзе вагацца ад 9 да 14 рублёў за дрэва вышынёй да 1 метра і да 50 рублёў за 5-метровую прыгажуню. Цана ёлак у кадках — ад 10 да 14 рублёў за паўметровую ёлку, ад 15 да 22 рублёў — за 1 метр, кошт ёлкавага букета будзе складаць да 6 рублёў.

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

22248>

9 771990 763008

Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «МЫ ПАВІННЫ ЗАЎСЁДЫ ЗЫХОДЗІЦЬ З ТАГО, ШТО МЫ — ДЗЯРЖАВА СУВЕРЭННАЯ І НЕЗАЛЕЖНАЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што гэтыя праграмы ні ў якім разе не закранаюць суверэнітэт і незалежнасць ні Беларусі, ні Расіі. Ён заўважыў, што зараз ужо нагнятаецца абстаноўка. А пасля перагавораў будуць казаць, што ўсё, у Беларусі ўжо няма ўлады, тут ужо расіяне пешшу ходзяць і кіруюць краінай. «Яшчэ раз хачу падкрэсліць гэтую асаблівасць: ніхто, акрамя нас, Беларуссю не кіруе. Гэта нашы функцыі па Канстытуцыі. Мы рэалізоўваем гэтыя функцыі. Шмат хто ў нас пачынае шаптацца, калі не атрымліваецца дамовіцца, што Расія ставіць непрымальныя для нас умовы, звязаныя з нашай незалежнасцю і суверэнітэтам. Абсалютна шчыра кажу: пры ўсіх складанасцях Расійская Федэрацыя хоча будаваць адносіны з суверэннай незалежнай дзяржавай Беларусь. Калі Расія ўспрымае нас як незалежную суверэнную дзяржаву, але вельмі блізкую, вельмі надзейную, дзе ўсё рускае, ад мовы да традыцый, свята шануецца, — мы гатовыя выбудоўваць адносіны. Але мы павінны заўсёды зыходзіць з таго, што мы дзяржава суверэнная і незалежная», — падкрэсліў Прэзідэнт, дадаўшы, што «суверэнітэт і незалежнасць мы павінны свята захоўваць, бо гэтага хоча беларускі народ». «Але мы ніколі не будзем ворагамі Расіі і ніколі коса ў бок Расіі глядзець не будзем. Гэта самая блізкая нам дзяржава, самыя блізкія нам народы», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Але «суверэнітэт і незалежнасць непарушныя. І ўсякія размовы ў нас ці там — значыць здрада інтарэсам беларускага народа. Так, мы з Расіяй як суверэнная і незалежная дзяржава. Я гэта кажу спакойна, ведаючы пазіцыю прэзідэнта Расіі. Мы нават гэтае пытанне не абмяркоўваем, мы гэтае пытанне аднойчы адсеклі і дамовіліся, як будзем дзейнічаць, падпісаўшы гэтыя 28 праграм. Ні ў адной праграме няма замаху на наш суверэнітэт і незалежнасць», — канстатаваў беларускі лідар.

## ПРАГРАМЫ МАЮЦЬ КАНКРЭТНАЕ ПРЫКЛАДНОЕ ЗНАЧЭННЕ

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ўжо ніхто не сумняваецца ў тым, што гэтыя праграмы, гэты стратэгічны шлях былі неабходнасцю. Праграмы маюць канкрэтнае прыкладное значэнне і закліканы знізіць негатыўны эфект нелегітымных заходніх санкцый, забяспечыць развіццё ключавых сектараў эканомікі, паглыбленне прамысловай кааперацыі, рэалізацыю новых імпартазамяшчальных праектаў. Па яго словах, да ўвядзення санкцый расіяне не ведалі, на што здольныя беларусы. «А калі грымнулі санкцыі і прыйшлося нам шукаць выйсце з нейкіх сітуацый, яны ўбачылі, што Беларусь — высокатэхналагічная краіна, якая выробляе ўсё, што трэба для жыцця. А калі не вырабляе, то цягам двух-трох месяцаў, паўгода можа вырабляць», — адзначыў Прэзідэнт. Ён прывёў у прыклад беларускія абаронныя праграмы. Па яго словах, калі яны будуць выкананы, то Беларусь заявіць аб сабе як надзвычай эфектыўная дзяржава.

Урад пастаянна дакладвае Прэзідэнту аб праведзенай значнай рабоце па фарміраванні дагаворна-прававой базы супрацоўніцтва з Расіяй у развіццё гэтых стратэгічных праграм. На нарадзе ён яшчэ раз актуалізаваў пытанні, якія дамоўленасці дасягнутыя, як выконваюцца праграмы, якія кірункі прабуксоўваюць. «Важна, каб гэта было агучана ў прысутнасці расійскай дэлегацыі. Спакойна, без крыкаў, без гвалту. Калі мы ў нечым вінаватыя, значыць, трэба прызнаць; калі расійскі бок таксама дзесьці недапрацаваў, трэба таксама пра гэта казаць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама пацікавіўся, ці вялікая верагоднасць таго, што падпісаныя пагадненні знімуць усе перашкоды на шляху нашых тавараў, а для суб'ектаў гаспадарання будуць створаны сапраўды роўныя ўмовы?

«Я думаю, што ў нас адно пажаданне да расійскага боку — стварыць роўныя ўмовы для работы суб'ектаў гаспадарання. Каб сельгаспрадпрыемствы, нашы прамысловыя прадпрыемствы, кампаніі, сфера паслуг і гэтак далей працавалі ў роўных умовах. Важна, каб цэны на газ, нафту былі не завоблачныя пры гэтых умовах», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, на першы план таксама выходзяць пытанні цэнаўтварэння на энергарэсурсы ў сувязі з канкурэнтаздольнасцю нашай эканомікі. Канкурэнтаздольнасць залежыць ад гэтых цэн.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што рашэнні павінны ісці ад жыцця і дыктавацца задачамі, якія стаяць у сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Таксама важнае пытанне — каардынацыя дзеянняў пры кроках у адказ на ўзмацненне санкцыйнага ціску. Па словах Прэзідэнта, меры, якія прымаюцца расійскім бокам, ні ў якім разе не павінны перашкаджаць транзіту беларускай прадукцыі ў трэція краіны праз тэрыторыю Расіі. Таксама не павінна быць ніякіх прэтэнзій пры экспарце на расійскі рынак беларускіх тавараў і паслуг.

У сваім дакладзе прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка далажыў, што за апошнія два гады дасягнуты прагрэс у вырашэнні тых пытанняў, па якіх на працягу доўгага часу не знаходзілі разрадкі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### Супрацоўніцтва з Расіяй стратэгічнае, планавае, канструктыўнае

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА** ў размове з журналістамі падвёў вынік нарады, якая была спланавана як падрыхтоўчая да перагавораў у панядзелак. «Прэзідэнтам была пастаўлена задача падрабязна прайсціся па ўсім спектры беларуска-расійскіх узаемаадносін, далажыць, што было зроблена за апошнія некалькі гадоў, як развіваецца інтэграцыйны парадак дня, як рэалізуюцца саюзныя праграмы, якія пытанні вырашаны, якія пытанні не вырашаны, якія знаходзяцца ў працэсе вырашэння. Менавіта пытанні стратэгічнага характару, якія датычацца таго, у якім напрамку павінны развівацца беларуска-расійскія адносіны ў наступныя гады, асабліва ва ўмовах тых выклікаў, з якімі мы сутыкаемся разам з Расійскай Федэрацыяй на міжнароднай арэне. Атрымалі карэкціроўкі і ўказанні ад Прэзідэнта. І ўжо ў гэтым рэчышчы мы будзем фарміраваць парадак дня для сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў і парадак дня для абмеркавання на ўзроўні кіраўнікоў урадаў», — сказаў прэм'ер-міністр.

Раман Галоўчанка дадаў, што па шматлікіх пытаннях з расійскімі калегамі знойдзены рашэнні. Але застаюцца яшчэ неўрэгуляваныя пытанні, якія складана вырашыць у сувязі з рознай ацэнкай або поглядамі. «Мы іх абсалютна спакойна абмяркоўваем і думаем, што па большасці з іх падчас гэтага візіту зможам знайсці рашэнне. Супрацоўніцтва з Расіяй стратэгічнае, планавае, канструктыўнае. Ёсць рознасць меркаванняў па нейкіх пытаннях, але гэта абсалютна пераадольна», — адзначыў ён.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Масква не пярэчыць супраць уключэння Афрыканскага саюза ў G20

**Расія не пярэчыць супраць ідэі ўключэння Афрыканскага саюза ў G20. Аб гэтым заявіў намеснік кіраўніка міністэрства замежных спраў РФ Міхаіл Багданаў, перадае РІА «Навіны».**

«Мы ў прынцыпе не супраць, канешне, у нас сапраўды вельмі развітыя, прасунутыя адносіны з Афрыканскім саюзам, афрыканскімі краінамі. Трэба праводзіць кансультацыі ў рамках «Дваццаткі», — адзначылі ў МЗС. Багданаў дадаў, што рашэнне аб уключэнні Афрыканскага саюза ў G20 павінны прымаць усе краіны, якія ўваходзяць зараз у гэтае аб'яднанне, а не толькі ЗША. Раней прэзідэнт Злучаных Штатаў Джо Байдэн афіцыйна запрасіў Афрыканскі саюз стаць пастаянным членам Вялікай дваццаткі (G20). Ён таксама паабяцаў, што на працягу трох гадоў Вашынгтон выдзеліць $55 мільярдаў на дапамогу Афрыцы. Напярэдадні СМІ пісалі, што ключавой задачай Злучаных Штатаў у Афрыцы з'яўляецца стрымліванне эканамічнага росту Кітая, а не дапамога афрыканскім дзяржавам у барацьбе з эканамічнымі праблемамі.

### НАТА вызначыла ваенны бюджэт на наступны год: рост больш як на 25 працэнтаў

**НАТА вызначыла памер ваеннага бюджэту на 2023 год. Яго памер складзе амаль 2 млрд еўра, паведамляе ТАСС са спасылкай на прэс-службу альянсу.**

У час пасяджэння Паўночнаатлантычнага савета былі вызначаны грамадзянскі і ваенны бюджэты. Так, грамадзянскі бюджэт прыняты ў памеры 371 млн еўра, што амаль на 28 працэнтаў больш за бюджэт гэтага года. Ваенны склаў амаль 2 млрд і павялічыўся больш як на 25 працэнтаў у параўнанні з 2022 годам. У заяве НАТА тлумачыцца, што грамадзянскі бюджэт змяшчае сродкі на персанал, розныя аператыўныя і праграмныя расходы штаб-кватэры НАТА і яе міжнароднага штаба. З ваеннага бюджэту будуць фінансавацца аперацыйныя расходы штаба каманднага падраздзялення альянсу, місіі і аперацыі па ўсім свеце.


СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «ВЫИГРЫВАЙ С ONLINER 31»

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

2. Заинтересованное лицо рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «МИ БАЙ», юридический адрес: 220007, г. Минск, ул. Аэродромная, 125, пом. 21, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 291478180, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 26.06.2017.

3. Сроки проведения рекламной игры: с 07.11.2022 по 16.01.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения рекламной игры).

4. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4253, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 20.10.2022.

5. Количество участников рекламной игры – 1906 чел.

6. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда рекламной игры составляет 8819 (восемь тысяч восемьсот девятнадцать) белорусских рублей 04 (четыре) копейки. Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

7. Информация о победителях рекламной игры:

| № п/п | Фамилия, инициалы победителя | Сведения о выигрыше |
|---|---|---|
| 1 | Каредина М. Ф. | Приз (тур № 1) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 2 | Черник В. В. | Приз (тур № 1) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 3 | Горбунов В. В. | Приз (тур № 2) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 4 | Дерюго А. В. | Приз (тур № 2) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 5 | Добровольская А. И. | Приз (тур № 3) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 6 | Василевич Е. А. | Приз (тур № 3) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 7 | Прокофьев И. А. | Приз (тур № 4) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |
| 8 | Фещенко В. М. | Приз (тур № 4) – BHR5512EU пылесос Xiaomi Vacuum Cleaner G11 (MJWXCQ05XYHW), денежные средства в размере 122,38 бел. руб. |

8. Для получения приза победители должны явиться не позднее 16.01.2023 (включительно) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором рекламной игры по номеру многоканального телефона +375 (29) 514 35 24.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 декабря 2022 г. проводит 1А от 11 августа 2022 г. повторный открытый аукцион по продаже имущества

| Номера лотов | Наименование имущества | Начальная цена торгов, бел. руб., (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 2 | Электроагрегат АД 30Т-400М2 № ВК22263292, инвентарный номер – 88-94 | 1 200,00 | 120,00 |

**Место нахождения имущества: г. Минск, ул. Калиновского, 8.**

Имущество, выставленное на аукцион, находится в республиканской собственности и хозяйственном ведении ГВТУП «Белспецвнештехника».

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 28 декабря 2022 г. в 10.45.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 23 декабря 2022 г.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 28 декабря 2022 г.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь в течение 10 банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.
3. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем (единственным участником) по фактическим затратам не позднее следующего дня после их проведения.
4. РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: (017) 323-50-63, (017) 367-58-05.

Электронная почта: **auk@bsk.by.**

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by.**

# Адпачынак, канферэнцыя і начлег... на запраўцы

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

— У дакуменце ўказаны аб'екты, якія існуюць, праектуюцца і будуюцца, а таксама тыя, якія прапануюцца для размяшчэння. Схема ўзгоднена з аблвыканкамамі, каб у дакуменце былі адлюстраваны тыя ўчасткі ўздоўж дарог, дзе няма абмежаванняў, звязаных з выключэннем зямель сельскагаспадарчага і ляснога карыстання. Гэта зручна і для інвестараў, якія могуць па схеме выбраць упадабаны кавалак дарогі і ў межах аднаго кіламетра вызначыцца, дзе яны захочуць збудаваць новы аб'ект, — расказаў **Сяргей ЛЯВОНЧЫК, начальнік упраўлення развіцця аўтамабільных дарог галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый.**

Сумесна з Міністэрствам спорту і турызму транспартнікі маніторацъ і аналізуюць існуючыя аб'екты. Многія аб'екты ўражваюць асартыментам і колькасцю тавараў, а новыя і рэканструяваныя запраўкі аб'яднання «Беларуснафты» зручныя для наведвальнікаў сваім стандартызаваным уладкаваннем. У гандлёвых залах тут на звыклых месцах змяшчаюцца касы і кавааўтаматы, а ўваход у санітарную зону добра відаць адусюль, дадаў прадстаўнік Мінтранса.

У межах праграм Саюзнай дзяржавы спецыялісты прааналізавалі нормы і стандарты, якія дзейнічаюць у дачыненні да прыдарожнага сэрвісу ў Расіі і Беларусі, і сфарміравалі табліцу, дзе прапісалі ўсе асаблівасці і нюансы. Аднак у большасці ўсе гэтыя нормы ідэнтычныя ў абедзвюх краінах, а вопыт развіцця прыдарожнага сэрвісу Беларусі пераймаюць рэгіёны Расіі.

### Пыласос, электразарадка, душ

575 аўтазаправак «Беларуснафты» размеркаваны па ўсёй краіне, і тут прапануюцца розныя паслугі, якія могуць спатрэбіцца аўтамабілісту на шляху, запэўніў **Юрый АНАНЧАНКА, начальнік упраўлення нафтазабеспячэння аб'яднання «Беларуснафта»:**

— Гэта і разнастайныя тэхнічныя і харчовыя тавары, падкачка шын, пыласосы і нават асобныя пункты па шынамантажы, якія месцяцца на тэрыторыі нашых аўтазаправак. Новыя станцыі мы стараемся будаваць у найбольш запатрабаваных на трасах месцах. Увага ўдзяляецца таксама магчымасці паркавацца велікагрузам — зроблена 20 пляцовак для караванераў.

Паколькі «Беларуснафта» з'яўляецца дзяржаўным аператарам па электразарадках, на 600 запраўках ужо можна зарадзіць электрамабілі. Яшчэ 33 будуць збудаваны да канца 2022-га, і электразаправачныя станцыі развіваюцца адпаведна магчымасцям, якія ёсць у пэўных рэгіёнах па падключэнні. Напрыклад, плануецца будаўніцтва дзвюх электразарадных станцый у раёне Лагойска, а ў 2023-м з'явіцца электразапраўка ў Глыбокім.

Гандлёвыя залы на запраўках сталічнага рэгіёна сёлета актыўна мадэрнізуюцца (удасканалены чатыры аб'екты), і налета гэтая работа працягнецца яшчэ на шасці, дадаў **Максім РАДАБОЛЬСКІ, намеснік дырэктара па рознічным гандлі прадпрыемства «Беларуснафта-Мінскаўтазапраўка»:**

— Лепш прадстаўляць асартымент прадукцыі агульнага харчавання і лінейку спадарожных тавараў. Будуць зручныя месцы, каб падсілкавацца, а на прыдарожных аб'ектах — прыняць душ ці зарадзіць электрамабіль.

### Будаваць запраўкі часта не трэба

У Беларусі існуюць рэкамендаваныя адлегласці размяшчэння запраўвачных станцый для розных катэгорый дарог (40—50 кіламетраў), аднак яны неабавязковыя і выконваць іх на шкоду рэнтабельнасці і прыбытку не варта, адзначыў Сяргей Лявончык:

— Калі аўтамабіліст рухаецца па аўтабане, скажам, у Германіі, то ён праязджае гэтыя 60 кіламетраў за 20 хвілін. Вядома ж, у яго няма патрэбы рабіць прыпынкі кожныя 20 хвілін. У Беларусі свае дазволеныя хуткасныя рэжымы, таму і запраўкі будуюцца на адпаведных ім адлегласцях. Пры будаўніцтве новай запраўкі вельмі сур'ёзна мадэлююцца патокі транспарту ў прывязцы да пэўнага рэгіёна, існуючай запраўкі, інтэнсіўнасці руху. Таму на ўсіх дарогах будаваць такія аб'екты часта не трэба.

Існуюць пэўныя катэгорыі, мінімальныя патрабаванні, сацыяльныя стандарты — гэтага дастаткова. А кожны рэгіён у сваіх патрэбах абапіраецца на запыты людзей. Насельніцтва прывыкае да іх размяшчэння, і, нават калі аб'ект закрываецца на рэканструкцыю, побач абавязкова ставіцца модульная запраўка, каб паслугі аказваліся, дадаў ён.

### Тавары і паслугі — для людзей і ад людзей

Наладжваць узаемадзеянне аўтазаправак з мясцовымі жыхарамі, якія маглі б прапаноўваць на рэалізацыю сваю прадукцыю з уласнага ўчастка, не плануецца, кажуць спецыялісты.

— На запраўках прапануюцца рэальна запатрабаваныя тавары, якія неабходныя ў дарозе. А на прадукцыю патрабуюцца сертыфікаты, якія пацвярджалі б яе бяспечнасць, а таксама месца і ўмовы для захоўвання. Ланцужок па прыёмцы тавару, яго рэалізацыі і адказнасці за якасць жорстка рэгламентаваны, таму проста прыняць ад некага прадукцыю і гандляваць ёю немагчыма, — канстатаваў Максім Радабольскі. — Да таго ж існуюць патрабаванні да наяўнасці пэўнага тавару: ён або павінен знаходзіцца на паліцы, або не.

З іншага боку, прыдарожныя комплексы скіраваны прымаць і задавальваць патрэбы ўсіх наведвальнікаў, таму стваraюцца ўмовы для баўлення часу малых і магчымасці для знаходжання хатніх гадаванцаў. Гульнявая зона для дзяцей, якая знаходзіцца на вуліцы, павінна быць агароджана і мець толькі адзін уваход, каб бацькі кантралявалі, дзе іх малы.

Новыя аб'екты прыдарожнага сэрвісу можна ўбачыць на сайце ў інтэрнэце і там жа задаць пытанне і ўнесці прапанову. Адной з запатрабаваных паслуг з'яўляецца наяўнасць месца для арганізацыі сустрэч. На запраўцы ў аэрапорце, напрыклад, ужо ёсць невялікая зала чалавек на дзесяць, дзе можна правесці канферэнцыю, і ёй карыстаюцца, удакладніў Юрый Ананчанка:

— Там ёсць магчымасць падключыцца да інтэрнэту, правесці нейкую прэзентацыю. Мы бачым, што часта на запраўках проста ў зале кафетэрыя, калі там няма асобнага памяшкання, людзі садзяцца за столікі, адкрываюць ноўтбукі і нешта абмяркоўваюць. Здараюцца і наведвальнікі, адзін з якіх мясцовы, а другі рухаецца па трасе, і яны ладзяць сустрэчу на запраўках. Гэта ўжо запатрабаваная рэальнасць, таму каля столікаў арганізавана магчымасць зарадкі тэлефонаў і ноўтбукаў.

Спецыялісты запэўнілі, што колькасць паслуг і надалей будзе павялічвацца адпаведна патрэбам спажыўца.

**Ірына СІДАРОК.**

# НА ПАЛЕССІ З'ЯВІЛАСЯ EVIKA

**РУП «Белтэлекам» адкрыў новы напрамак сваёй дзейнасці: сетку электразарадных станцый пад брэндам Evika. Першая такая станцыя з'явілася ў Пінску**




**Генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Юрый ПЕТРУЧЭНЯ** падчас прэзентацыі праекта падкрэсліў, што ў Беларусі паспяхова рэалізоўваецца комплексная праграма развіцця электратранспарту:

— РУП «Белтэлекам» як дзяржаўны тэлекамунікацыйны аператар бачыць сваю задачу ў тым, каб самыя актуальныя трэнды і тэхналагічныя навінкі былі даступныя жыхарам буйных гарадоў і невялікіх населеных пунктаў.

**Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і камерцыйных пытаннях РУП «Белтэлекам» Сяргей ТУРОМША** таксама адзначыў, што за першы квартал 2023 года плануецца запуск яшчэ 19 зарадных комплексаў (16 — у Мінску і па адным — у Брэсце, Салігорску і Наваполацку).

Устаноўлены ў Пінску зарадны комплекс двухпаставы, адначасова зараджацца ад яго могуць два электракары ці аўто з гібрыдным рухавіком. Магутнасць станцыі — 22 кВт на пост. Гэта забяспечвае поўную зарадку батарэі пераменным токам за 4—8 гадзін. На кожнай станцыі размешчаны інструкцыі, у якіх нескладана разабрацца нават навічку. Акрамя таго, у мэтах бяспекі на ЭЗС будзе дзейнічаць сістэма відэакантролю.

Каб скарыстацца зарадкай, трэба ўсталяваць мабільны дадатак ISKRA. Ён дапаможа адшукаць найбліжэйшую зарадную станцыю, пракладзе да яе маршрут, пакажа тэхнічныя параметры сесіі і дасць магчымасць сачыць за ходам зарадкі. Гэты дадатак ужо даступны для спампоўкі ў App Store і ў Google play. Кошт зарадкі — 0,4 руб за 1 кВт•г.

**Лізавета ГОЛАД,
фота аўтара.**

# ПРЫГАЖУНЯ З ЛЕСУ: РАДАСЦЬ, А НЕ ПРАБЛЕМЫ

**Пры гэтым у кожным рэгіёне ўстаноўлены свае даты адкрыцця такіх кірмашоў. Самыя першыя навагоднія гандлёвыя пункты па продажу ёлак пачнуць абслугоўваць пакупнікоў у Брэсцкай вобласці 17 снежня. У Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях гандаль пачнецца з 20 снежня, у Гомельскай — з 22-23 снежня. Пра гэта расказаў першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр ДРАГУН.**

З 22 снежня Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр прадставіць сваю прадукцыю ў Мінску на вуліцы Прытыцкага, 146. У сталіцы таксама з 16 снежня пачне працаваць кірмаш на базе Мінскага лясгаса (вуліца Баграціёна, 70), а Капыльскі доследны лясгас арганізаваў гандлёвы пункт на Лагойскім тракце, 52. Цэны захаваны на ўзроўні мінулага года. «Цэны ні ў якім разе не павялічацца. У лясніцтвах ёлку да метра можна будзе купіць ад 8 рублёў, да двух метраў — ад 10 рублёў. На кірмашах кошт будзе вышэйшы за кошт затрат на лагістыку і дастаўку. Набыць навагоднее дрэва ў кадцы можна за 20 рублёў», — распавёў першы намеснік міністра.

Дарэчы, Дзяржлесахова з другой дэкады снежня пераходзіць на ўзмоцнены рэжым работы, каб прадухіліць незаконную высечку елак і сасноў. У адпаведнасці з КаАП РБ, за незаконную высечку ў прыродаахоўных, рэкрэацыйна-аздараўленчых і ахоўных лясах парушальнікі прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ад 5 да 30 базавых велічынь. Акрамя гэтага, з вінаватага спаганяецца шкода, прычыненая навакольнаму асяроддзю.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НАВАГОДНЯЯ АРЫФМЕТЫКА

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Наталля Мельнікава расказала, што ў найбліжэйшыя дні будзе праведзена больш за 14 тысяч розных мерапрыемстваў. Па апошніх даных ужо праведзена 2,5 тысячы святочных распродажаў, больш за 700 рэкламных акцый, 75 дэгустацый, 6 рэкламных гульняў. Начальнік упраўлення гандлю і грамадскага харчавання МАРГ адзначыла, што на гэты год запланавана вытворчасць больш чым 2 мільёны салодкіх падарункаў, з якіх сёння на ўнутраны рынак ужо пастаўлена каля 1,5 мільёна. Асартымент такіх падарункаў налічвае больш за 500 найменняў кандытарскіх вырабаў, якія спакаваныя ў тым ліку ў мяккія цацкі. Маса такіх падарункаў — ад 300 грамаў да 2 кілаграмаў. Цана — ад 6 да 55 рублёў у залежнасці ад вагі і камплектацыі.

Многія ўстановы грамадскага харчавання актыўна прымаюць заказы не толькі на карпаратывы, але і на прыгатаванне страў да свят. Цэны на карпаратывы — ад 40 да 200 рублёў на чалавека.

Акрамя таго, пакупнікам прапануюць больш за дзве тысячы найменняў ёлачных упрыгажэнняў, сувеніраў. Больш чым 100 найменняў штучных ёлак (з іх больш як 40 відаў айчыннай вытворчасці) па рознічных цэнах ад 6 да 1370 рублёў. Звыш за 100 відаў карнавальных касцюмаў (ад 10 да 265 рублёў), у тым ліку касцюмаў Дзеда Мароза і Снягуркі.

Шампанская, як запэўніла прадстаўнік МАРГ, на рынку таксама хапае. Усяго на паліцах ёсць 40 найменняў. Цана — ад 7 рублёў.

### Сталіца будзе радаваць глінтвейнам

А з гэтай суботы ў цэнтры Мінска каля Палаца спорту пачынае «шэсце» вялікі «Калядны кірмаш», які працягнецца да 15 студзеня, паведаміла **дырэктар КУП «Мінскзнешгандальінвест» Марына САЕВІЧ**. Кірмаш будзе працаваць з 14.00 да 22.00 у будні і з 11.00 да 23.00 у святы і на выхадных. У навагоднюю ноч пляцоўка адкрыта да 04.00.

На кірмашы будзе 30 драўляных гандлёвых домікаў і фудтрэкаў. Можна будзе паспрабаваць стравы армянскай, узбекскай, карэйскай і іншых нацыянальных кухань. Вядома, будуць і беларускія пачастункі.

Арганізатары абяцаюць дранікі, бліны, смажаныя слімакі, дагестанскія пірагі, шашлыкі з морапрадуктаў і многае іншае. Наведвальнікам прапануюць глінтвейн і іншыя напоі ў разліў. Таксама будуць канцэрты, парк дзіцячых атракцыёнаў, шоу самавараў і тэатралізаваныя паказы.

### Падарункі рыхтавалі яшчэ з верасня

Цёртая какава, какава-алей і какава-парашок — аснова ідэальнай горкай пліткі шакаладу. У складзе — дзясятак інгрэдыентаў, вялікая частка мясцовай вытворчасці. Сваё малако, вяршкі і цукар. Фруктовае пюрэ цяпер таксама беларускае, раней яго закуплялі. Вырашылі праблему і з пакаваннем, імпартную замянілі на ўласную і расійскую.

На канвееры не толькі шакалад — у навагодніх падарунках больш за ўсё цукерак. Асартымент пастаянна змяняецца і залежыць ад попыту. Рэцэптуры традыцыйныя, пад заказ робяць і эксклюзіўныя цукеркі. Іх пакуюць у скрынкі, мяшкі, тубы, цацкі.

«Савецкія брэнды заўсёды ёсць. У кожным падарунку — «Чырвоная Шапачка», «Птушынае малако» — тыя цукеркі, якія любяць і дарослыя, і дзеці», — патлумачыла **намесніца генеральнага дырэктара ў камерцыйных пытаннях кандытарскай фабрыкі Святлана ГОНТАРАВА.**

На фабрыцы выпускаюць больш за мільён падарункаў штогод — для беларусаў і замежнікаў. У падарункі дадалі зефір і халву ад іншых беларускіх вытворцаў. На карце паставак фабрыкі — амаль 20 краін. Палова з іх хоча бачыць у сябе навагодні падарунак з Беларусі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БАЕЦ НЯБАЧНАГА ФРОНТУ

## Чаму без сродкаў радыёэлектроннай барацьбы сёння нельга ўявіць ні любы ўзброены канфлікт, ні мірнае жыццё?

**Нябачная зброя — электрамагнітныя хвалі — здольная не толькі поўнасцю дэзарыентаваць праціўніка, паралізаваць варожую тэхніку і ўзбраенне, але і абараніць ад знешніх уздзеянняў сваю тэрыторыю. Нельга пераацаніць ролю радыёэлектронных сродкаў і ў мірным жыцці. Дзякуючы ім, мы можам перадаваць інфармацыю на розныя адлегласці, пры гэтым неабавязкова ў самых спрыяльных умовах.**

Якое значэнне радыёэлектронныя сродкі маюць у сучасных ваенных канфліктах, чаму найбуйнейшыя арміі свету аддаюць перавагу беларускай тэхніцы РЭБ і як войскі радыёэлектроннай барацьбы, якія ўчора адзначылі 80-годдзе свайго існавання, будуць развівацца ў найбліжэйшы час, расказаў **начальнік упраўлення радыёэлектроннай барацьбы Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Ігар ДАНІЛЬЧЫК.**

***— Ігар Іванавіч, упершыню сродкі радыёэлектроннай барацьбы былі прыменены ў гады Вялікай Айчыннай вайны, падчас Сталінградскай бітвы, якая поўнасцю змяніла далейшы ход падзей...***

— 16 снежня 1942 года Дзяржаўны народны камісарыят абароны пастанавіў, што РЭБу быць. У крытычна малыя тэрміны былі сфарміраваны тры першыя радыёдывізіёны — папярэднікі нашых воінскіх часцей, — якія ўпершыню прынялі ўдзел у Сталінградскай бітве. Потым яны добра адзначыліся ў ходзе аперацыі «Баграціён», пры вызваленні Кёнігсберга. Гэта было заўважана ў тым ліку праціўнікам, які казаў аб тым, што стала складана перадаваць інфармацыю ў радыёсетках. Менавіта тады ўпершыню адчулі, што такое радыёэлектронная барацьба.

***— У 1950-я гады, калі пачалося адраджэнне войск РЭБ, яны сталі называцца службай перашкаджэння і абароны. Якія задачы выконваюць цяперашнія падраздзяленні радыёэлектроннай барацьбы?***

— Перашкаджаць і абараняць — тыя дзве найважнейшыя функцыі, якія ляжаць у аснове і сучаснай радыёэлектроннай барацьбы. Цяпер яны гучаць па-іншаму — радыёэлектроннае паражэнне і радыёэлектронная абарона. Сутнасць жа радыёэлектроннай барацьбы засталася ранейшай, не змянілася за гэтыя гады. Памянялася тэхніка, удасканалілася падрыхтоўка спецыялістаў, задачы сталі функцыянальна больш шырокімі, ажыццяўляецца поўнае насычэнне радыёэлектроннымі сродкамі аб'ектаў. «Разумны дом» прыходзіць да нас у кватэру, сувязь пятага пакалення стукаецца ў дзверы. Магчыма, у наступным годзе мы яе адчуем і ўбачым. Развіццё — усюды. І на полі бою таксама. Важнай з'яўляецца сітуацыйная дасведчанасць на полі бою: каб да кожнага салдата, кожнага камандзіра хутка і дакладна даводзілася інфармацыя, каб ён валодаў тым, што робіць суседзі, чым занятыя ўзаемадзейнікі, падтрымлівальнікі, каб сувязь была дакладная і надзейная. Гэта характэрна і для радыёэлектроннай барацьбы — зрабіць усё для таго, каб праціўнік не мог перашкодзіць забяспечыць радыёэлектронную абарону нашых сродкаў. З іншага боку, імкнёмся зрабіць так, каб праціўнік не забяспечыў надзейнай сувяззю свае войскі.



***— Напэўна, у сучасных умовах гэта вельмі няпроста?***

— Заўсёды было няпроста. Цяпер стала больш усяго. У той жа час сучасныя магчымасці дазваляюць выконваць задачы прасцей. Электронна-вылічальныя машыны аблегчылі нам жыццё, сам падыход да радыё цяпер абсалютна іншы. Развіццё тэхналагічнай асновы і праграмнага забеспячэння дазволілі па-іншаму трансліраваць інфармацыю, інакш яе прымаць. Калі раней можна было казаць аб тым, што адзін сродак сувязі — адна лінія сувязі, а адна адзінка станцыі перашкод — адзіная магчымасць падавіць што-небудзь, цяпер жа ўся тэхніка — мультызадачная. Бясконцае развіццё тэхналогій падштурхоўвае да таго, што патрэбна забяспечыць устойлівую, надзейную сувязь. Для гэтага прымяняюцца шматлікія падыходы, якія дазваляюць дасягнуць мэты рознымі дарогамі, шляхамі. Часам — аб'язнымі. Любым спосабам дастаўляць інфармацыю ў пункт прызначэння — гэта адзін з прынцыпаў сеткацэнтрычных войнаў, калі інфармацыя трапляе з пункта «А» ў пункт «Б» не па прамой, а па розных крывых, чым забяспечваецца надзейнасць яе дастаўкі да спажыўца. У гэтай сітуацыі нам патрэбна знайсці ўсе гэтыя «дарожкі» і паспрабаваць іх знішчыць.



***— Тэхніка РЭБ, якая стаіць на ўзбраенні беларускай арміі, адпавядае найлепшым сусветным стандартам. Якое ўзбраенне трапіць у нашы войскі ў найбліжэйшы час?***

— Не буду раскрываць сакрэты, якая тэхніка трапіць на ўзбраенне. А вось у тым, што тэхніка паступае, прычым рэгулярна, няма ніякіх сакрэтаў. 14 снежня ў Полацку, у пункце пастаяннай дыслакацыі 228-га асобнага палка, мы ўручылі тэхніку і гэтаму палку, і 10-му асобнаму батальёну РЭБ. Тэхніку стварыла наша прамысловасць. Прыемна, што паступіла яна да нас напярэдадні прафесійнага свята. Увогуле, аб якасці нашай тэхнікі найбольш красамоўна сведчыць яе продаж па ўсім свеце. Гэта найлепшы доказ таго, што яна запатрабаваная. Прычым у самых патрабавальных і распешчаных пакупнікоў, якія сярод таго, што прапануюць на сусветным рынку, могуць выбраць усё самае лепшае, нягледзячы на цану. У гэтым канкурэнтным жорсткім асяроддзі нашы прадпрыемствы перамагаюць, і беларуская тэхніка трапляе на ўзбраенне замежных дзяржаў. Гэта сведчыць аб тым, што якасць і тыя тэхналагічныя задзелы, якія закладзены ў гэтую тэхніку, лепшыя, чым у найбуйнейшых сусветных кампаній, якія ствараюць вядомае на ўвесь свет узбраенне. Тое, што мы ў шасцёрцы найбуйнейшых сусветных вытворцаў тэхнікі РЭБ, — адназначна. Нам ёсць, чым ганарыцца. Тэхніка пастаянна ўдасканальваецца, мы не стаім на месцы.

***— Прычым нагоды для ўдасканалення і развіцця рэгулярна падкідвае ваенна-палітычная абстаноўка ў свеце...***

— Хто ў мінулым годзе ўсур'ёз успрымаў аматарскія квадракоптары, якія людзі выкарыстоўваюць для здымак сваіх падзей: вяселляў, падарожжаў, паходаў і інш.? Без квадракоптара цяпер нікуды. Ён выкарыстоўваецца ўсюды. Беспілотны лятальны апарат — адзін з асноўных дапаможных вырабаў на полі бою. Калі б мы не глядзелі наперад, то аказаліся б поўнасцю не гатовымі да праблемы барацьбы з квадракоптарамі. Разам з канструктарамі стварылі тэхніку, якая апярэдзіла шырокае выкарыстанне гэтых вырабаў на полі бою. Мы можам спакойна глядзець у будучыню, бо наша тэхніка дазваляе змагацца з гэтымі вырабамі, прычым на вельмі добрым узроўні. Квадракоптары, якія прапаноўваліся год таму і цяпер, — дзве вялікія розніцы. Адпаведна, у сувязі з развіццём высокіх тэхналогій рэгулярна трэба ўдасканальваць тэхніку. Аднак дзякуючы таму, што наша тэхніка гнуткая, паддаецца праграмаванню, нам, па вялікім рахунку, няма неабходнасці мяняць «жалеза». Мы можам выкарыстоўваць тое, што ёсць. Дастаткова змяніць софт — і ў тэхніцы атрымліваецца абсалютная новая якасць. Гэта адно з адрозненняў сучаснай тэхнікі ад той, якая эксплуатавалася за савецкім часам, дзе фізічныя магчымасці былі завязаны на «жалезе», з якога яна выраблялася.

***— Нярэдка беспілотныя лятальныя апараты, якія выкарыстоўваюцца грамадзянамі ў сваіх інтарэсах, парушаюць паветраную прастору і аказваюцца там, дзе іх быць не павінна. Як гэтае пытанне ўрэгулявана на заканадаўчым узроўні?***

— Тут усё зроблена так, як трэба. Для грамадзянскіх беспілотных лятальных апаратаў вызначаны дыяпазон работы, максімальныя магутнасці. У гэтай галіне ёсць рэгулятар, кантрольны орган — Беларуская дзяржаўная інспекцыя па электрасувязі. Яна сочыць і за тым, як ажыццяўляецца парадак эксплуатацыі квадракоптараў у асабістых мэтах, і за тым, каб у гандлёвых сетках прадаваліся дазволеныя вырабы. Акрамя таго, вызначаны пералік забароненых зон да палётаў. Ён пастаянна публікуецца, абнаўляецца. Тыя, хто хоча законна выкарыстоўваць свой квадракоптар, можа з гэтым пералікам азнаёміцца: ён у адкрытым доступе. Некаторыя кампаніі ўжо на заводзе пры стварэнні ўносяць у памяць гэтых вырабаў інфармацыю, якая не дазволіць заляцець і выканаць палёт у забароненай зоне. Іншая справа — зламыснік, які пры наяўнасці пэўных навыкаў унёс змены ў праграмнае забеспячэнне, можа «ўзламаць» гэтыя забароны і ажыццявіць палёт там, дзе яго нельга здзяйсняць. У гэтым выпадку на абароне нашага закона выступаем і мы, і многія іншыя структуры. Мы можам забяспечыць радыёблакаду ў неабходных раёнах, каб там ні пры якіх умовах нельга было выкарыстоўваць квадракоптары. У нас ёсць і арганізацыйныя (заканадаўчыя), і фізічныя — ажно да знішчэння — метады ўздзеяння на незаконнага



парушальніка. Чаму б і не, калі гэта пагражае жыццю і здароўю нашых грамадзян?

***— Ужо год як функцыянуе Цэнтр радыёманіторынгу Узброеных Сіл. Якія задачы ён вырашае?***

— За спектрам грамадзянскага прызначэння кантроль ажыццяўляе Беларуская дзяржаўная інспекцыя па электрасувязі. Усё, што звязана з сілавымі структурамі і тымі ўчасткамі радыёчастотнага спектра, якія вылучаны ў інтарэсах сілавых структур, ажыццяўляем мы. Каб не было ніякіх парушэнняў, каб адзін аднаму не перашкаджалі, з Белдзяржінспекцыяй па электрасувязі ў нас наладжаны шчыльны кантакт. Больш за тое, у нас ёсць міжведамасны дакумент, які дазваляе хутка і камфортна абменьвацца інфармацыяй у гэтай галіне і вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць паміж грамадзянскімі карыстальнікамі і карыстальнікамі нашых сілавых структур. За год мы напрацавалі добры вопыт. Нашы дзяжурныя пастаянна на сувязі з дзяжурнымі Белдзяржінспекцыі па электрасувязі. Яны даюць нам свой рэсурс для кантролю. Мы, калі патрабуецца, даём ім свой. Фактычна разам кантралюем поўнасцю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Калі дзесьці хто-небудзь пачне незаконна вяшчаць, мы гэта хутка высветлім і прыменім да парушальніка меры адміністрацыйнага ўздзеяння.

***— Ва Узброеных Сілах пачаўся новы навучальны год. Якія кірункі развіцця войскаў РЭБ будуць для вас прыярытэтнымі?***

— Асноўнае, на чым будзе сканцэнтравана наша ўвага, — баявая падрыхтоўка. Неабходна сысці ад фармалізму і шаблонных форм у баявой падрыхтоўцы, каб пастаянна адсочваць новыя тэндэнцыі, якія ёсць у свеце. Асабліва важна ў гэтым плане ўлічыць вопыт спецыяльнай ваеннай аперацыі. Мы бачым, што адбываецца, і нам неабходна гэта пераламляць у плоскасці баявой падрыхтоўкі сваіх воінскіх часцей — часта нават прымяняючы незвычайныя для нас формы, тактычныя прыёмы.

***— Што канкрэтна, зыходзячы з вопыту спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, патрабуе вашай увагі?***

— Усе ўбачылі, што падчас спецыяльнай ваеннай аперацыі вельмі шырока выкарыстоўваюцца квадракоптары. Прычым для вырашэння розных баявых задач: у асноўным з мэтай разведкі, агнявой падтрымкі. Натуральна, мы не можам гэтага не заўважаць, таму навучаем нашы экіпажы для барацьбы з квадракоптарамі. У прыватнасці, адпрацоўваем прыёмы па недапушчэнні гэтых вырабаў на полі бою. Нягледзячы на дзіцячасць, якая здаецца такой на першы погляд, квадракоптары ўяўляюць вельмі сур'ёзную цэль для супрацьдзеяння. Яны мініяцюрныя, маюць малую эфектыўную плошчу рассейвання, іх складана — практычна немагчыма — выявіць традыцыйнымі сродкамі радыёлакацыі, радыётэхнічнай разведкі, паколькі сігналы, якія ў іх выкарыстоўваюцца, вельмі слабыя і нешумападобныя. Пры пэўных абставінах гэты малы, амаль незаўважны выраб уяўляе вялікую пагрозу. У прыватнасці, як неаднаразова мы бачылі ў тэлевізійных сюжэтах, квадракоптар часта выкарыстоўваюць для таго, каб скідваць выбуховыя рэчывы на галаву праціўніка. Дзякуючы сваёй дакладнасці (квадракоптар можа падабрацца вельмі блізка), дасягаецца патрэбны эфект і наносіцца вялікая шкода праціўніку. Выявіць беспілотны лятальны апарат — вельмі складаная задача. Гэтаму мы ўжо цяпер вучымся і будзем вучыцца. Упэўнены, што падчас новага навучальнага года мы дасягнём новых высокіх вынікаў у баявой падрыхтоўцы і выкананні задач па прызначэнні. Аддаючы даніну мужнасці і гераізму, ратнай працы нашых папярэднікаў, звяртаюся да тых, хто стаіць на варце мірнай працы Рэспублікі Беларусь. Ад вашага ўмення, вытрымкі і прафесіяналізму залежыць мір і спакой Айчыны. Цвёрда веру, што вы і надалей будзеце беражліва захоўваць гераічныя традыцыі нашых папярэднікаў, самааддана служыць нашаму народу. Са святам вас, шаноўныя ветэраны, афіцэры, прапаршчыкі і сяржанты, курсанты і салдаты! Добрага здароўя вам і вашым блізкім, дабрабыту і шчасця, поспехаў у самаадданым служэнні нашай Радзіме!

**Вераніка КАНЮТА.**

Векапомнае

# ПОШУКАВАЯ ВАХТА КАДЭТАЎ

## Як выхаванцы Гомельскага кадэцкага вучылішча спрычыніліся да расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе

**Каля тысячы прадметаў — страшных знаходак — ляглі ў аснову экспазіцый школьных музеяў Гомельшчыны, прысвечаных генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Перададзеныя на захоўванне артэфакты былі знойдзены байцамі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны падчас раскопак расстрэльных ям у Чонкаўскім лесе. Значная частка знаходак узбагаціла экспазіцыю музея Гомельскага кадэцкага вучылішча. Менавіта яго выхаванцы з'яўляюцца адзінымі непаўналетнімі, хто атрымаў права разам з прафесіяналамі ўдзельнічаць у раскопках па расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў Чонкаўскім лесе.**



### Трагічная праўда

Аб удзеле гомельскіх кадэтаў у раскопках вельмі цікава — да мурашоў на скуры — расказвае **настаўнік гісторыі Гомельскага кадэцкага вучылішча Павел ДЗЕНІСЕНКА:** «Выкрываецца яма, а там астанкі 50—60 чалавек ляжаць у некалькі пластоў. Было, што выкрывалі толькі верхні пласт і ўздымалі астанкі адразу 15—20 чалавек. Гэта жудасна, але для падрастаючага пакалення менавіта гэта адкрывае праўду пра вайну. Суровую, страшную, трагічную, але праўду».

Павел Уладзіміравіч — не толькі педагог, але і кіраўнік вядомага ў Беларусі пошукавага клуба «Пунсовыя пагоны». Узначальвае ён і рэспубліканскую «Кадэцкую пошукавую асацыяцыю» ўсіх кадэцкіх суворацкіх вучылішчаў і спецыялізаваных ліцэяў краіны. «Мы адзінае грамадскае аб'яднанне, якое на тэрыторыі Гомельскай вобласці бярэ ўдзел у раскопках па расследаванні справы аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — адзначае Павел Дзенісенка. — Гэта трагічная старонка гісторыі, якую доўгія гады замоўчвалі. У 1944—1945 гадах былі складзены акты Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, але на гэтым усё спынілася. Толькі пасля ўзбуджэння Генеральнай пракуратурай крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа ў кастрычніку мінулага года пачалося сур'ёзнае расследаванне. Высветлілася, што месцаў, дзе былі масава знішчаны і пахаваны мірныя людзі, на тэрыторыі Беларусі велізарная колькасць».

Да раскопак ахвяр генацыду ў Чонкаўскім лесе Павел Уладзіміравіч разам са сваімі выхаванцамі ўдзельнічаў у раскопках ваенных пахаванняў у Смаленскай і Бранскай абласцях Расійскай Федэрацыі. Аднак тое, што кадэты ўбачылі і асэнсавалі для сябе падчас раскопак пад Гомелем, падлеткам цяжка нават перадаць словамі. Моцна ўразіла, што ў Чонкаўскім лесе знойдзена шмат рэчаў менавіта мірных людзей: ключы ад дома, грабеньчыкі, кашалькі з грашыма, пенснэ, гадзіннікі, талеркі, кружкі...

— Вельмі страшна падчас раскопак убачыць яму, дзе радамі ляжаць астанкі маладых дзяўчат, — дзеліцца ўражаннямі навучэнка трэцяга курса Гомельскага кадэцкага вучылішча Дар'я Белавус. — Да такога відовішча нельга прызвычаіцца. Бярэ за душу, калі трымаеш у руках рэчы, якія належалі гэтым людзям.

Не першы год удзельнічаюць у раскопках і гомельскія кадэты Уладзіслаў Жолудзь і Віталь Байлукоў. Хлопцы расказваюць, што для іх удзел у пошукавых вахтах — магчымасць сваімі рукамі дакрануцца да тэмы Вялікай Айчыннай вайны.



— Быў складзены графік, і кадэты штодня па зменах, да замаразкаў, прыязджалі на аўтобусе ў Чонкаўскі лес, — заўважае Павел Дзенісенка. — Нават на канікулах юнакі і дзяўчаты працягвалі ўдзельнічаць у раскопках. Хтосьці з равеснікаў нашых кадэтаў бавіць час на рэчцы, хтосьці — у Турцыі, а гэтыя дзеці тут камароў кормяць...

### Запаведзі бяспекі

Кадэты і іх настаўнік падкрэсліваюць, што падчас удзелу ў раскопках, якія ўжо сталі часткай іх жыцця, эмацыянальная ўзрушанасць ні ў якім разе не павінна затуманьваць розум. Асновай асноў — тэхніка бяспекі. Падлеткі добра ведаюць, як правільна паводзіць сябе ў месцах, дзе можна сустрэцца з выбухованебяспечнымі прадметамі. У Рэспубліцы Беларусь зацверджана дакладная нарматыўная база, якая агаворвае ўдзел фізічных асоб і грамадскіх арганізацый у пошукавых работах сумесна з 52-м асобным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны.

— Мы працуем у масках і пальчатках, — удакладняюць кадэты. — З боепрыпасамі часоў Вялікай Айчыннай трэба быць вельмі асцярожнымі. Калі раптам убачыў іржавую пляму — трэба клікаць дарослых.

Сярод небяспечных знаходак, якія былі знойдзены ў раскопках, — ручныя гранаты і супрацьтанкавая міна, рэвальвер і снайперская вінтоўка. Гэтыя прадметы падымаюць і абясшкоджваюць толькі байцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна.

Кадэты ведаюць і правілы працы з рыдлёўкай: адзін капае, другі рукі ў зямлю не ўсоўвае, таму што можна атрымаць траўму. Непасрэдна ў раскоп можа спусціцца падлетак, якому споўнілася 16 гадоў. На дапаможных работах на паверхні, пасля інструктажу па тэхніцы бяспекі, дзеці могуць працаваць з 14 гадоў. Гэта ўсё дакладна выконваецца.

### Спусціцца ў яму, каб захаваць памяць

— Увогуле, пошукавая работа нашых кадэтаў стала магчымай дзякуючы ўзаемадзеянню з пракуратурай, — дадае **дырэктар Гомельскага кадэцкага вучылішча Дзмітрый ГРЫГАРЭНКА.** — Калі дзеці праходзяць праз такія палявыя пошукавыя работы, вельмі хутка сталеюць. Яны вераць, што суровыя выпрабаванні, праз якія прайшлі ў гады Вялікай Айчыннай вайны нашы продкі, — не выдумка, і пачынаюць больш разумець рэальную палітыку фашысцкай сістэмы, якая мэтанакіравана знішчала народы. За знойдзенымі астанкамі дзеці бачаць лёсы людзей, у якіх адабралі жыццё толькі за тое, што яны размаўлялі на іншай мове, мелі іншыя палітычныя погляды ці проста апынуліся не ў тым месцы не ў той час, — падлеткі паіншаму пачынаюць асэнсоўваць сваё жыццё.

Дарэчы, музейныя экспазіцыі з артэфактаў, знойдзеных падчас раскопак расстрэльных ям у Чонкаўскім лесе, таксама створаны пры падтрымцы супрацоўнікаў пракуратуры. Галоўная ідэя такіх выстаў — не хаваць жывыя сведчанні генацыду беларускага народа «пад шкло». Усе экспанаты можна кранаць рукамі. Так падлеткі змогуць лепш зразумець, што жыццё — не камп'ютарная гульня, калі можна «захавацца», а пасля ўсё пачаць нанова.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота даслана Гомельскім кадэцкім вучылішчам.**

---

Праверана на сабе. Жаночы погляд

# ЯК СВЯТКУЮЦЬ НОВЫ ГОД У АРМІІ?

**Перадсвяточная мітусня, агеньчыкі на вокнах, пах мандарынаў у паветры — усе чакаюць падзеі, ад якой зноў пачнецца адлік. Новага года чакаюць і тыя, хто носіць ваенны мундзір. Для людзей у пагонах свята на пасту — звычайная справа. Але, нягледзячы на шматзадачнасць, гэты дзень для іх таксама важны, як і для ўсіх, хто правядзе яго ў коле сям'і.**



### Адбой далёка за поўнач

У перадсвяточны дні ў вайсковых часцях пах пораху змяняецца водарам мандарынаў. Салдацкія інтэрнаты пераўтвараюцца ва ўтульныя пакоі, на тварах байцоў з'яўляюцца ўсмешкі і нават на палігонах усе ў прадчуванні свята. Ну які Новы год без ёлкі?! Традыцыя ставіць ёлку, упрыгожваць казармы, клубы і тэрыторыю ёсць і ў вайсковых часцях.

Раніца 31 снежня ў салдат пачынаецца з прыбірання памяшканняў і падрыхтоўкі да ўрачыстасці. Адны закупляюць прадукты на стол, іншыя рэпецыруюць нумары канцэрта і рыхтуюць конкурсы, трэція па-ранейшаму займаюцца паўсядзённымі вучэбна-баявымі задачамі. Да некаторых прыязджаюць родныя — у апошні дзень года на КПП заўсёды шматлюдна.

Навагодняя ноч для вайскоўцаў, напэўна, — той рэдкі выпадак, калі адбой не ў дзесяць гадзін вечара, а далёка за поўнач. Зварот Прэзідэнта па тэлебачанні, смачны стол і салют — усё амаль як дома. Для салдат гэтая ноч таксама важная, як і для тых, хто сустракае свята сярод сям'і. Так, сваякі, сябры далёка, але побач з імі таксама не чужыя — за час службы баявыя таварышы становяцца роднымі. І нават жаданні ў іх падобныя: мір на зямлі і ў кожным доме.

### Навагоднія падарункі ад партызан

Служба ў войску — не падстава адкласці чароўнае свята на год. Нават у самыя цяжкія дні Вялікай Айчыннай на фронце, у тыле і на акупаваннай тэрыторыі савецкія людзі адзначалі Новы год. У тую ноч яны жадалі толькі аднаго: каб хутчэй вайна скончылася Перамогай.

Святкавалі Новы год і партызаны. «Наш Дед Мороз, наш славный дед, принес нам чудеса Побед. Но внук, не уступая Деду, несет нам полную Победу!» — такімі радкамі народныя мсціўцы віталі наступленне 1943 года ў газеце «Бобруйский партизан».

Найлепшым падарункам ад партызан былі ўдала спланаваныя аперацыі. З дзённіка Аляксандры Хромавай, байца атрада Краўцова (2 студзеня 1943 года): «Вось і Новы год. Учора партызаны атрада Міхайлоўскага павіншавалі фашыстаў — пусцілі пад адхон эшалон з жывой сілай».

А хто сапраўды чакаў свята, нават пад грукат артылерыйскіх гармат, — дык гэта дзеці. Галоўнае іх жаданне — Дзед Мароз з падарункамі. Вайскоўцы рабілі ўсё магчымае, каб іх мары спраўдзіліся. З успамінаў Пятра Ганчарова, камандзіра атрада «За Радзіму»: «Аднойчы я і начальнік штаба, надзеўшы белыя маскіровачныя халаты, якія павінны былі прадстаўляць касцюмы Дзеда Мароза і Снягуркі, прывозілі ў вёскі сані з хлебам і аладкамі для дзяцей. Адзін аднаго мы віншавалі звычайна толькі на словах — у атрадзе ў кожнага было толькі самае неабходнае, і ўзяць падарунак не было адкуль».

Гэтымі днямі хочацца павіншаваць усіх людзей у пагонах. На зямлі і ў паветры. Тых, хто нясе службу і ў аддаленых гарнізонах і на баявых пастах. Яны апранаюць форму амаль пад бой гадзіннікаў і працягваюць рабіць важную справу. Усё — для таго каб беларускае неба і граніцы былі пад надзейнай абаронай.

**Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ.**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 декабря 2022 г. на 24-м открытом аукционе проводит 19-й от 22 сентября 2022 г. и 23-й от 8 декабря 2022 г. повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 224 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К1-131 в составе: кузов-фургон К1-131 № 02402 1983 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 535277 дв. 883554 1983 г. 3 кат. 4526 км 12,5 м/ч | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 7 700,00 | 1 540,00 |
| 225 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К4-131 в составе: кузов-фургон К4-131 № 060906 1981 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 499204 дв. 698511 1982 г. 3 кат. 4045 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 7 700,00 | 1 540,00 |
| 227 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: кузов-фургон К6-131 № 05611 1983 г. 2 кат., автошасси ЗиЛ-131 ш. 542958 дв. 921150 1983 г. 3 кат. 2924 км | г. Осиповичи, в/ч 01313 | 7 700,00 | 1 540,00 |
| 245 | Автошасси ЗИЛ 131 ш. 361297 1979 г., пробег 1311 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 9 000,00 | 1 800,00 |
| 246 | Автошасси ЗИЛ 131 ш. 532018 1983 г., пробег 1108 км | г. Молодечно, в/ч 04152 | 9 000,00 | 1 800,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **28 декабря 2022 г. в 10.00**.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 23 декабря 2022 г.**

**Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 28 декабря 2022 г. с 9.15 до 10.00.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 бел. руб. за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:
белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000,
российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: (017) 319-35-41, +375 (44) 583-77-45.

Электронная почта: **auk@bsk.by.**

Извещение опубликовано на сайте **http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в дер. Прилепы, пер. Школьный (объект 79/2021), дер. Малое Залужье, ул. Центральная (объект 108/2021), дер. Малое Залужье, ул. Заречная (объект 65/2021) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района, Минской области**

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Прилепы, пер. Школьный | 624883008301000620 | 0,1200 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30 000 |
| 2 | дер. Малое Залужье, ул. Центральная | 624883006601000165 | 0,124 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 12 000 |
| 3 | дер. Малое Залужье, ул. Заречная | 624883006601000164 | 0,15 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 12 000 |

**Аукцион состоится 19 января 2023 г. в 15.00** в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 50066).

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 600046563

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2023.Ч.002.00003** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026, г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 (0212) 36-27-07.

**Организатор, оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 17.01.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-141307 площадью 92,7 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4-1В, наименование – помещение многофункциональное, назначение – помещение многофункциональное, места общего пользования: лестничная клетка – 16,3 кв. м, лестничная клетка – 16,4 кв. м, лестничная клетка – 11,0 кв. м, насосная – 3,8 кв. м. Изолированное помещение с инв. № 200/D-141311 площадью 41,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, д. 4-1Е, наименование – складское помещение, назначение – складское помещение, помещение между 1-м–2-м этажами; места общего пользования: лестничная клетка – 17,8 кв. м, лестничная клетка – 15,8 кв. м, машинное отделение – 18,9 кв. м

**Нач. цена:** 47 887,57 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 4788,75 бел. руб.

Объекты находятся на земельном участке с кадастровым номером 240100000001000497 площадью 3,9964 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 4 (общая долевая аренда).

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by». **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу **https://etpvit.by, в**нести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 16.01.2023. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и независимой экспертизы внутренней оценки, оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки и на проведение независимой экспертизы внутренней оценки по лоту №1 составляют 1322,68 бел. руб. с НДС*. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: **https://etpvit.by,** в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Позняк Светлана Георгиевна, +375 (33) 317 50 00.

## ОАО «Минскоблхлебопродукт»

**извещает, что общее совместное с ОАО «Лошницкий край» собрание акционеров состоится 30 декабря 2022 года по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2.**

Начало собрания в 14.00. Регистрация акционеров с 13.30 до 13.55.
При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт».
2. Об утверждении решения о дополнительном выпуске акций ОАО «Минскоблхлебопродукт».
3. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Минскоблхлебопродукт».

***Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт», тел. 282-57-57***

УНП 600013173

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Мотобур ВТ 360 | 756,00 | 75,60 | 37,80 |
| 2 | Станок 8Г | 864,00 | 86,40 | 43,20 |
| 3 | Станок СМЖ | 252,00 | 25,20 | 12,60 |
| 4 | Пресс-ножницы | 1260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 5 | Вагон-бытовка строительная | 352,80 | 35,28 | 17,64 |
| 6 | Вагон-бытовка строительная | 504,00 | 50,40 | 25,20 |
| 7 | Вышка строительная сборно-разборная передвижная ВСРП-2500-20 | 324,00 | 32,40 | 16,20 |
| 8 | Компьютеры согласно списку 1: https://docs.google.com/document/d/1JzbpKeJTzQE4Z9CrgAdLod5NMS7Vcahx/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 616,16 | 61,62 | 30,81 |
| 9 | Кап. строение (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – одноэтажное кирпичное здание конторы) с инв. № 630/С-39007, общей площадью 335,3 кв. м, с составными частями и принадлежностями (три навеса); система пожарной сигнализации; мебель согласно списку 2: https://docs.google.com/document/d/1JfGDgIl07rVeKKkVpMHVTxKuAb91IAXi/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 91704,90 | 9170,49 | 4585,24 |
| 10 | Оборудование согласно списку 3: https://docs.google.com/document/d/1EuWvjcW5KZJsl4iM5STLhFMh1QIXcAww/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 3367,93 | 336,79 | 168,40 |
| 11 | Кап. строение (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание базы) с инв. № 630/С-38998, общей площадью 870,5 кв. м; мебель согласно списку 4: https://docs.google.com/document/d/1OuPLBa0AxoC8WSqv1QTePYtLqxJ8zovu/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 129540,87 | 12954,09 | 6477,04 |
| 12 | Леса согласно списку 5: https://docs.google.com/document/d/1iSG4vAz0k2sOJeXe0-m-dfrqv0ut7Zzn/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1066,57 | 106,66 | 53,33 |
| 13 | Столы каменщика согласно списку 6: https://docs.google.com/document/d/1uHq2x5x-ZPq_zi6MhDw0uroMSM5E8Pzb/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 954,00 | 95,40 | 47,70 |

В отношении лотов №№ 1–13 проводятся седьмые повторные торги. **В отношении лотов № 9 и № 11 стоимость снижена на 60 %. В отношении лотов №№ 1–8, 10, 12, 13 стоимость снижена на 70 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 110 (29732) от 08.06.2022, № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 7, № 159 (29781) от 16.08.2022, № 175 (29797) от 07.09.2022, стр. 6, № 194 (29816) от 04.10.2022, стр. 14, № 214 (29836) от 01.11.2022, стр. 15, № 233 (29855) от 26.11.2022, стр. 10

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **30 декабря 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **С 10.00 19.12.2022 до 16.00 28.12.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 |
| **Земельный участок** | Лоты № 9 и № 11 расположены на земельном участке с кадастровым № 642000000003000670, площадью 0,8586 га (74/100 доли) для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы по ул. Металлистов, 1 в г. Молодечно. Право аренды |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых 30.12.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам 1–8, 10, 12, 13 составляет 7 % от конечной цены предмета торгов; по лотам 9, 11 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Татьяне Степановне (+375291877401). По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру, +375293396845. Дополнительная информация по лотам №№ 1–8, 10, 12, 13 по тел. +375293042560, Андрей, по лотам №№ 9, 11 – по тел. +375293082762, Екатерина.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1) в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур)** |

# Праўда, якую павінны ведаць усе

## Своеасаблівая энцыклапедыя па генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'явілася ў кожным рэгіёне краіны

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваў і прэзентаваў серыю зборнікаў «Без тэрміну даўнасці. Беларусь: злачынствы нацыстаў і іх памагатых супраць мірнага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны». Шэсць тамоў — па кожнай з абласцей — без перабольшванняў і эмацыянальных уставак гісторыкаў і архівістаў сведчаць аб тым, што ў 1941—1944 гадах чужынцы, якія прыйшлі на нашу зямлю, планавалі поўнасцю зруйнаваць яе, пераўтварыўшы беларускі народ у попел...**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.

Часткова гэтыя жудасныя планы нацыстаў былі рэалізаваны: шматлікія помнікі і мемарыялы на тэрыторыі спаленых у Вялікую Айчынную населеных пунктаў, на месцах масавага і не толькі знішчэння грамадзян дагэтуль нагадваюць нам, якой цаной беларусам дасталіся мір і незалежнасць. Пра многія злачынствы фашыстаў і іх памагатых на працягу доўгага часу не прынята было гаварыць. Аднак ніхто не забараняў памятаць аб тым, хто і якім чынам пазбаўляў жыцця дзяцей і старых, жанчын і хворых, людзей, якія яшчэ нават не з'явіліся на свет...

На жаль, многіх злачынцаў ужо няма ў жывых. Некаторыя ўжо дажываюць свой гнілы лёс у шэрагу дзяржаў. Неаднаразова ў межах расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа Генеральная пракуратура звярталася да іх з просьбай аб прававой дапамозе ў выдачы ваенных злачынцаў. Не дапамагаюць, берагуць былых карнікаў, рукі якіх запэцканыя крывёю савецкіх людзей. Дакументы, апублікаваныя ў зборніках, падрыхтаваных Нацыянальным архівам, змаглі б даказаць віну многіх з іх. Вядома, час ваенных трыбуналаў даўно скончыўся, але ж самы справядлівы суд — памяць людзей — будзе дзейнічаць заўжды. Нават праз пакаленні — такі генетычны код беларускага народа.

Як ствараліся зборнікі «Без тэрміну даўнасці. Беларусь», чым унікальныя гэтыя кнігі, расказаў адзін з укладальнікаў шматтомнага выдання, **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**

***— Вячаслаў Дзмітрыевіч, колькі часу пайшло на тое, каб падрыхтаваць шэсць зборнікаў — грунтоўных навуковых прац па генацыдзе беларускага народа ў кожнай з абласцей краіны?***

— Мы іх выдалі за два гады. Працу пачалі ў чэрвені 2020 года. Шосты зборнік выйшаў у чэрвені 2022 года. Да 75-годдзя Нюрнбергскага працэсу над нацысцкімі злачынцамі ў Расійскай Федэрацыі было прынята рашэнне падрыхтаваць зборнікі дакументаў аб злачынствах нацыстаў у адносінах да мірнага насельніцтва па кожным акупаваным рэгіёне Расіі. У пачатку 2020 года ў Нацыянальны архіў прыехаў дырэктар фонду «Гістарычная памяць» Аляксандр Дзюкаў і прапанаваў падрыхтаваць на гэтую ж тэму шэсць тамоў — па кожнай з абласцей нашай краіны. Мы, зразумела, не маглі адмовіцца ад такой прапановы, але пайшлі па іншым шляху з улікам назапашанага вопыту публікацый па гэтай тэме. Пачынаючы з сярэдзіны 1990-х гадоў, Нацыянальны архіў выдаў больш за 20 зборнікаў дакументаў аб акупацыйнай палітыцы нацыстаў на тэрыторыі Беларусі па самых розных тэмах: адгон насельніцтва на прымусовыя работы, Халакост, знішчэнне беларускіх вёсак. Мы стварылі зборнікі дакументаў аб найбуйнейшых нацысцкіх лагерах на нашай тэрыторыі — Трасцянцы і Азарычах. Толькі ў нашай краіне ўбачылі свет выданні аб трох найбуйнейшых карных аперацыях гітлераўцаў, якія былі праведзены ў Беларусі: «Зімняе чараўніцтва», «Котбус» і «Карман». Беларусь — адзіная дзяржава на постсавецкай прасторы, дзе створана электронная база спаленых вёсак. Шэраг матэрыялаў на тэму акупацыі таксама выдалі нашы абласныя архівы. Таму яшчэ да таго, як паступіла прапанова стварыць зборнікі па генацыдзе ў кожным рэгіёне краіны, у нас быў напрацаваны вялікі масіў выданняў па гэтай праблематыцы.

***— Яшчэ некалькі гадоў таму пра абнародаванне такіх дакументаў, якія змешчаны ў шматтомным выданні, нават не вялося размовы...***

— У пачатку 1990-х гадоў практычна ўся дакументацыя па тэме Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася на сакрэтным захоўванні. Работа па рассакрэчванні дакументаў пачалася адразу пасля гарбачоўскай перабудовы. Да 2000 года ў Нацыянальным архіве рассакрэцілі ўсе дакументы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Таму калі ў Расіі для таго, каб падрыхтаваць гэтыя зборнікі, некаторыя дакументы давялося рассакрэчваць, то ў нас такой праблемы не было.



Копия.

...РУССКИЙ ШТАБ ПАРТИЗАНСКОГО ДВИЖЕНИЯ

...копий воспрещается

Совершенно секретно

ШИФРОВКА вх. № 1499.

86

...в шифротделение „10" января 1943 г. „13" час. „40" мин.

„10" января „23" час. „35" мин.

152 з/з Зап. Фронт

Начальнику Главного Развед Управления Красной Армии.

Центр. 3 января немцы произвели зверскую расправу над мирным населением деревень Разерье, Рыбцы, Хотежи, Руденского района. Убито 154 чел. мужчин, женщин и детей. Сожжено 200 дворов.

Подписи: Секретарь Руденского Райкома — Глебов
Минского — Пенун.
Жители деревни Разерье — Сазеев.
Сорока.

Латышев.

Экз. № 1 тов. Нач. ГРУ.
Экз. № 2 тов. Пономаренко
Экз. № 3 тов. Калинину.
Экз. № 4 тов.

ПОДЛЕЖИТ ВОЗВРАТУ
через 6 суток
в шифроотделение Белорусского штаба
партизанского движения

Копия верна:

Фота аўтара.

**Паведамленне Беларускага штаба партызанскага руху аб нямецкай расправе немцаў над мірнымі жыхарамі вёсак Разер'е, Рыбцы і Хацежы Рудзенскага раёна Мінскай вобласці. Указваецца, што 3 студзеня 1943 года карнікі забілі тут 154 чалавекі, спалілі 200 двароў.**

***— Каштоўнасць гэтай серыі выданняў у тым, што шырокай грамадскасці прапануюцца не толькі савецкія дакументы, якія выкрываюць злачынныя намеры нацыстаў. Нямецкія данясенні, акты, змешчаныя ў кнігах, без купюр сведчаць аб палітыцы генацыду ў дачыненні да беларускага народа...***

— Калі мы прыступалі да падрыхтоўкі кніг, было важна паказаць злачынствы нацыстаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі не толькі праз дакументы савецкага боку. У 2021 годзе нам з Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь перадалі крымінальныя справы на замежных ваеннапалонных, якіх у тым ліку судзілі і за ваенныя злачынствы. У іх утрымліваюцца каштоўныя дакументы, у якіх самі ваеннаслужачыя Вермахта, супрацоўнікі карных органаў расказваюць аб тым, што яны рабілі на акупаваных тэрыторыях. Гэта стварае аб'ектыўную карціну таго, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны адбывалася на тэрыторыі Беларусі, робіць тагачасную рэчаіснасць больш дакладнай і поўнай.

***— Як трафейныя дакументы апынуліся ў нас?***

— Частка ваенных нямецкіх дакументаў была захоплена савецкімі войскамі, частка апынулася ў амерыканцаў. Амерыканцы — дзелавыя людзі. Яны гэтыя дакументы алічбавалі і сталі прадаваць зацікаўленым краінам. У прыватнасці, наш былы Партыйны архіў у свой час набыў так званую александрыйскую стужку, на якой захоўваюцца нямецкія трафейныя дакументы. Некаторыя з іх з'яўляюцца фактaлагічным сведчаннем злачынстваў і на тэрыторыі Беларусі. Цяпер гэтая стужка актыўна выкарыстоўваецца супрацоўнікамі Генеральнай пракуратуры ў межах расследавання справы аб генацыдзе беларускага народа. З'явілася і яшчэ адна магчымасць доступу да нямецкіх дакументаў: электронныя копіі многіх трафейных дакументаў амерыканцы выстаўляюць на сайце свайго Нацыянальнага архіва. Некаторыя з іх мы выкарысталі падчас падрыхтоўкі зборніка па Мінскай вобласці. Многія трафейныя дакументы захоўваюцца ў Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі ў Падольску. Яны таксама робяць электронныя копіі і выстаўляюць іх на сайце. Такім чынам, сёння ёсць магчымасць працаваць з нямецкімі трафейнымі дакументамі. Частка з іх у свой час была звезена ў Асобы архіў у Маскву і засакрэчана. Да гарбачоўскай перабудовы аб гэтым архіве ніхто не ведаў. Натуральна, і доступу да яго не было. Ён з'явіўся толькі пасля распаду Савецкага Саюза.

***— А ці выкарыстоўваюць савецкія дакументы ў сваіх навуковых даследаваннях па тэме Другой сусветнай прадстаўнікі таго боку, які прайграў у гэтай вайне?***

— Немцы вельмі асцярожна адносяцца да савецкіх дакументаў. У прыватнасці, да дакументаў Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі. У гэтым вінаватыя мы самі. Справа ў тым, што фабрыкацыя дакументаў па Катыні Надзвычайнай дзяржаўнай камісіяй падарвала веру да гэтага органа, а адпаведна і да іх дакументацыі. Гэта была чыстай вады фальсіфікацыя: дакументы не прызнавалі віну органаў НКУС у забойстве польскіх ваеннаслужачых. Паводле заключэння Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, адказнасць за тое, што адбылося ў Катыні, ляжала на немцах. У сувязі з гэтым фактам дакументацыя, створаная Надзвычайнай дзяржаўнай камісіяй, у іх дагэтуль падлягае сумненню. У свой час я вазіў дакументы Нацыянальнага архіва на судовы працэс у Злучаныя Штаты Амерыкі, дзе вырашаўся лёс аднаго з карнікаў літоўскага паліцэйскага батальёна. Я заўважыў, што адносіны і ў амерыканцаў да нашай дакументацыі былі насцярожаныя, яны нават праводзілі экспертызу паперы — высвятлялі, ці адносіцца яна да таго гістарычнага перыяду.

***— Наўрад ці падобная насцярожанасць з'явіцца ў дачыненні да зборнікаў «Без тэрміну даўнасці. Беларусь», дзе кожны факт пацверджаны і нямецкімі дакументамі. Унікальнасць выданняў яшчэ і ў іх дадатках...***

— Мы пайшлі іншым шляхам, у адрозненне ад расіян, па структуры зборнікаў. У першым раздзеле шырока прадстаўлена тэма нацысцкай палітыкі генацыду і выпаленай зямлі, у другім — дакументальнае сведчанне расследавання ваенных злачынстваў. Таксама ў кожным са зборнікаў змешчана і па чатыры дадаткі, чаго няма ў нашых калег. У аснову дадатку «Месцы прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва» мы паклалі даведнік, які ў свой час быў падрыхтаваны Камітэтам па архівах і справаводстве (цяпер гэта Дэпартамент па архівах і справаводстве). Вядома, дадатак мы дапоўнілі. Асабліва гэта датычыцца гета. Падрыхтаваць дадатак «Спіс месцаў масавага знішчэння яўрэйскага насельніцтва Беларусі» ўдалося дзякуючы рабоце Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі на чале з дырэктарам Інай Герасімавай. Краязнаўца Аляксандр Паўлюковіч праявіў ініцыятыву і падрыхтаваў спіс найбуйнейшых карных аперацый, якія былі праведзены ў кожнай з абласцей. У аснову спіса знішчаных населеных пунктаў (не вёсак, бо знішчаліся і пасёлкі, і хутары) лягла электронная база спаленых беларускіх вёсак, якая была намі створана ў перыяд, калі мы займаліся рэалізацыяй гуманітарнага праекта «Павышэнне статусу выратаваных жыхарамі спаленых беларускіх вёсак». Падчас падрыхтоўкі зборнікаў мы таксама ўдакладнілі гэтую базу. У зборніках — шыкоўны ілюстрацыйны блок з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафонафотадакументаў, музеяў, асабістых архіваў. Гэтыя зборнікі — калектыўная работа. На жаль, многія не дачакаліся іх прэзентацыі. У прыватнасці, Аркадзь Шкуран, вязень лагера смерці «Азарычы», які перадаў нам унікальны гістарычны матэрыял і па гэтым лагеры, і па дзіцячым лагеры ў Скобраўцы ў Пухавіцкім раёне.

***— Для навуковай супольнасці Нацыянальны архіў падрыхтаваў шыкоўную базу. Засталося дачакацца новых даследаванняў па тэме Вялікай Айчыннай вайны...***

— Сёння ў нас няма ні аднаго навуковага даследавання ні па спаленых вёсках, ні па карных аперацыях. Усё засталося на ўзроўні савецкага часу. Асноўная праблема, якая выявілася падчас стварэння зборнікаў, — падрыхтоўка гістарычных прадмоў. Любыя лічбы, факты павінны пацвярджацца даследчыцкай работай, чаго ў нас, на жаль, не хапае. Не вызначана дакладна, што разумець пад гета, як адрозніць канцэнтрацыйны лагер ад лагера смерці. Юрыдычна правільным было б скласці класіфікацыю месцаў прымусовага ўтрымання насельніцтва. Той жа Шкуран на ўзроўні Вярхоўнага суда дабіваўся, што Азарычы — гэта не лагер на пярэднім краі, а канцэнтрацыйны лагер, як гэта ўказвалася ў дакументах Нюрнбергскага працэсу. Праўда, нічога не атрымалася. Той жа Трасцянец на ўзроўні даследчыкаў называюць то месцам, то лагерам знішчэння. Гэтыя дэфініцыі неабходна ўдакладняць.

***— Завяршаецца Год гістарычнай памяці, аб'яўлены кіраўніком дзяржавы. Наколькі, на ваш погляд, ён быў выніковым?***

— Зроблена многае. Прывяду толькі адзін прыклад, які сведчыць аб многім. Калі ў свой час мы стваралі базу спаленых вёсак, я аб'ездзіў многія краязнаўчыя музеі краіны, прасіў у супрацоўнікаў інфармацыю па спаленых вёсках. Яны паціскалі плячыма і казалі, што ніколі не займаліся гэтай тэмай. Цяпер жа, пагледзіце, кожны краязнаўчы музей нешта зрабіў па тэме генацыду. Вядома, у гэтым плане вялікі штуршок дала Генеральная пракуратура. Важная і ўвага дзяржавы да захавання гістарычнай памяці, праўды, якую, як мы і прадэманстравалі ў нашым выданні, больш ніколі не будзем і не павінны замоўчваць.

Вераніка **КАНЮТА.**

## Віктар ШНІП:

# «ПАКУЛЬ ЁСЦЬ ПІСЬМЕННІКІ — БУДУЦЬ І ЧАСОПІСЫ»

**За сто гадоў існавання гэты тоўсты літаратурны часопіс увасобіў у сабе цэлую эпоху... Летапіс беларускай літаратуры — так недарэмна называюць часопіс «Полымя». Пра юбілейныя мерапрыемствы, гісторыю часопіса і яго сёння мы гутарым з намеснікам дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўным рэдактарам часопіса «Полымя», вядомым паэтам Віктарам Шніпам.**

***— Напярэдадні юбілею вы, безумоўна, пераглядалі нумары «Полымя» ад яго стварэння. Ці можаце ацаніць, як змяняўся часопіс — і знешне, і па змесце, якія былі самыя заўважныя этапы яго трансфармацыі?***

— Праглядаў, і не адзін раз. Але ўсё праглядзець немагчыма, бо ў нас у рэдакцыі няма ўсіх нумароў, асабліва да 1960-х гадоў. За стагоддзе выйшла 1118 нумароў. Часопіс мяняўся: і выглядам, і аб'ёмам, і фарматам, і нават назва мянялася. У 1932—1941 гадах часопіс выходзіў як «Полымя рэвалюцыі».

Першую вокладку часопіса «Полымя» афарміў мастак Міхась Філіповіч. Першыя дзесяць гадоў (да 1932) часопісам кіравала рэдакцыйная калегія, у яе ўваходзілі Змітрок Бядуля, Цішка Гартны, Міхась Зарэцкі, Усевалад Ігнатоўскі, Янка Купала, Якуб Колас, Вульф Нодэль, Алесь Сянкевіч, Міхась Чарот і іншыя. Першым галоўным рэдактарам «Полымя» быў прызначаны Платон Галавач (1932—1933). У гады Вялікай Айчыннай вайны выданне часопіса было прыпынена. Адноўлена ў студзені 1945 года. Словам, жыццё мянялася ў Беларусі, і часопіс мяняўся, але заўсёды «Полымя» было і застаецца люстэркам актуальнага літаратурнага працэсу.

***— Галоўнымі рэдактарамі «Полымя» былі вельмі вядомыя асобы, слынныя беларускія літаратары... Як вы лічыце, наколькі асоба рэдактара накладае адбітак на выданне? Хто з галоўных рэдактараў «Полымя», на ваш погляд, быў самым адметным?***

— Якім будзе кожны новы нумар часопіса, у першую чаргу залежыць ад таго, што будзе ў ім друкавацца. Зразумела, што і нам сёння хацелася б працягваць друкаваць новыя творы Івана Шамякіна, Івана Мележа, Васіля Быкава, Янкі Брыля, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Андрэя Макаёнка, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, Міхася Стральцова, якія ў свой час сваімі публікацыямі і стварылі «Полымю» літаратурна-мастацкую вагу. Але іх няма, і, на жаль, цяпер мала пісьменнікаў іх узроўню. І ўсё ж мы стараемся, каб у кожным нумары быў свой «цвік», на якім і трымаўся б увесь змест часопіса.

Якім быць часопісу, залежыць і ад галоўнага рэдактара. Ад яго густу, ад яго ўзаемаадносін з патэнцыяльнымі аўтарамі выдання. Але я перакананы, што сярод адзінаццаці галоўных рэдактараў «Полымя», якія працавалі да мяне, не было такіх, якія зайздросцілі б сваім братам па пяры і стараліся не друкаваць творы, якія па сваім мастацкім узроўні часам вышэйшыя, чым піша сам галоўны рэдактар.

На маю думку, самым адметным галоўным рэдактарам быў Максім Танк, які ўзначальваў «Полымя» з 1948 да 1967 года.

***— Распавядзіце пра сённяшні дзень «Полымя»... Што змянілася, якія новыя рубрыкі з'явіліся, як памяняўся дызайн, кола аўтараў?***

— Былі часы, калі ў рэдакцыі «Полымя» працавала больш за дваццаць чалавек. І амаль усе пісьменнікі. Цяпер нас пяць. Анатоль Казлоў рыхтуе прозу, Наталля Казапалянская займаецца крытыкай і літаратуразнаўствам, а я — паэзіяй, ну і перачытваю ўсё тое, што падрыхтавалі да друку мае супрацоўнікі. Нядаўняя выпускніца філфака БДУ Аксана Казлова працуе стыльрэдактарам, а выпускніца тэхналагічнага ўніверсітэта Наталля Арцёмава вярстае часопіс. У яе дызайне і выходзіць наш юбілейны нумар. Яна ж распрацавала афармленне часопіса і на 2023 год.

У часопісе шмат рубрык: «Паэзія», «Проза», «Крытыка і літаратуразнаўства», «Згадкі», «Дзённікі», «Штрыхі да партрэта», «Постаці», «Пошукі і знаходкі», «Спадчына», «Эпісталярый», «Братэрства», «Галасы свету», «Навуковыя публікацыі», «Культура мовы», «Краязнаўства», «Кнігарня» і іншыя. Яны запаўняюцца нашымі пастаяннымі аўтарамі, якіх, дарэчы, у нас хапае, таму часам некаторым даводзіцца чакаць і паўгода, каб іх твор з'явіўся на старонках «Полымя». З радасцю друкуем маладых.

***— Калі вы асабіста ўпершыню прыйшлі ў рэдакцыю часопіса «Полымя»? Хто там працаваў, якая была атмасфера, як сустрэлі маладога аўтара?***

— У рэдакцыю «Полымя» я ўпершыню з вершамі прыйшоў у 1978 годзе. Тады там галоўным рэдактарам быў Кастусь Кірэенка. Мне было 18. Паэзіяй займаўся Анатоль Вялюгін. Яму было 55. Я ўспрымаў яго як дзеда, бо тады яшчэ не ведаў, што Анатоля Сцяпанавіча ўсе завуць Адміралам. Дзед Анатоль сядзеў за сталом і курыў. Браў мае вершы і казаў, каб прыйшоў праз пару месяцаў. Прыходжу. Сядзіць дзед за сталом, курыць і кажа: «Вершы добрыя! Прынясі яшчэ!» Прыношу. Дзед за сталом сядзіць і курыць. «Пакідай! Пачытаю! Прыходзь праз пару месяцаў!» — кажа і курыць. Прыходжу. «Вершы добрыя! Прынясі яшчэ!» — кажа дзед Анатоль. А потым, калі ў яго сабралася ладная кіпа маіх твораў, ён прайшоўся па лепшых і горшых і растлумачыў, чаму той верш добры, а той кепскі. І так было чатыры гады. І толькі праз чатыры гады дзед Анатоль для мяне стаў Адміралам. За гэты час я ўжо надрукаваўся па тры разы і ў «Маладосці», і ў «Беларусі», і два разы ў альманаху «Дзень паэзіі». І вось у маі 1982 года ў «Полымі» з'явіліся тры мае вершы. Наступная публікацыя была ў кастрычніку 1984 года. Нумар быў прысвечаны творчасці маладых і адкрываўся словамі Івана Шамякіна «Маладым сябрам». Маладымі тады былі: Генрых Далідовіч, Мікола Кусянкоў, Віктар Супрунчук, Хрысціна Лялько, Леанід Галубовіч, Уладзімір Марук, Уладзімір Мазго, Мікола Пракаповіч і яшчэ чалавек дзесяць. Я ў гэтай кампаніі быў сапраўды самым маладым. Мне было 24. «Маладому» Міколу Кусянкову — 49. Пра што гэта гаворыць? А пра тое, што ў «Полымі» былі вельмі высокія патрабаванні, і там проста па-сяброўску, ці толькі таму, што ты добры хлопец, ці дзяўчына прыгожая, нельга было надрукавацца. І цяпер я з удзячнасцю ўспамінаю Анатоля Вялюгіна, Адмірала, які быў для мяне адным з літаратурных настаўнікаў.

***— Якія прачытаныя на старонках «Полымя» творы вам запомніліся, паўплывалі на вас як на творцу?***

— Шмат што памятаецца і шмат якія нумары «Полымя» захоўваюцца па сёння ў маёй хатняй бібліятэцы. Але асабліва памятаецца «Полымя» канца 80-х гадоў, калі вучыўся ў Маскве ў Літінстытуце. Я там выпісваў часопіс. Кожны яго новы нумар быў сапраўдным і чаканым святам. Чытаў ад першай да апошняй старонкі і не адзін раз. І паэзію, і прозу. І ўсё, што чытаў, мяне натхняла на пісанне сваіх твораў.

***— Сёння тоўстыя літаратурныя часопісы ў папяровым выглядзе перажываюць крызіс... Некаторыя прагназуюць іх зніknenne. Што наконт гэтага думаеце вы?***

— «Полымю» 100 гадоў. І гэта гаворыць пра тое, што гэты часопіс быў патрэбен усе гэтыя гады. Думаю, што так будзе і далей. Калі не стане пісьменнікаў, тады і часопісаў не стане. А пакуль ёсць пісьменнікі, а яны ёсць, — будуць і часопісы. Электронныя выданні ніколі цалкам не заменяць папяровыя. Сеціва — гэта прорва, якая адкрылася для нас і якая можа ў любы момант зачыніцца і праглынуць усё, што мы там трымаем, думаючы, што там яно ў надзейным захаванні.

***— Ці павінен быць літаратурны часопіс толькі альманахам тэкстаў, ці ёсць магчымасць і патрэба ператварыць яго ў дыскусійную пляцоўку?***

— За 2022 год у часопісе «Полымя» надрукаваны чатыры круглыя сталы: «Дзе мой край?» (круглы стол, прысвечаны Году гістарычнай памяці), «Наша крытыка» (прысвечаны пытанням крытыкі і літаратуразнаўства), «Наша справа кніжная» (прысвечаны 50-годдзю выдавецтва «Мастацкая літаратура») і «Гістарычная місія, адказнасць і звышзадача» (прысвечаны 100-годдзю «Полымя»). Словам, на старонках часопіса ёсць магчымасць падыскутаваць. У новым годзе плануем круглыя сталы са старшынямі абласных аддзяленняў СПБ і супрацоўнікамі бібліятэк нашай краіны.

***— «Полымя» — адно з нешматлікіх выданняў, публікацыя ў якім лічыцца навуковай, прымаецца ў якасці такой Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй. Ці шмат да вас звяртаецца аўтараў-навукоўцаў? Як супрацоўнічаеце з імі?***

— У нас ёсць рубрыка «Навуковыя публікацыі». Сёлета надрукавалі чатырнаццаць літаратуразнаўцаў. Будзем друкаваць і далей. Адно хацелася б — каб навуковыя матэрыялы былі не па дваццаць старонак, а хоць бы па 10—12, і тады будзем мець магчымасць друкаваць болей навукоўцаў.




**«Якім быць часопісу, залежыць і ад галоўнага рэдактара. Ад яго густу, ад яго ўзаемаадносін з патэнцыяльнымі аўтарамі выдання. Але я перакананы, што сярод адзінаццаці галоўных рэдактараў «Полымя», якія працавалі да мяне, не было такіх, якія б зайздросцілі сваім братам па пяры і стараліся не друкаваць творы, якія па сваім мастацкім узроўні часам вышэйшыя, чым піша сам галоўны рэдактар».**

***— Ці істотная, на ваш погляд, розніца паміж акадэмічным літаратуразнаўствам і літаратурнай крытыкай? Ці ўплывае крытыка на густы сённяшняга чытача, і праз якія менавіта крыніцы?***

— Для часопіса больш падыходзіць літаратурная крытыка, якая зразумелая нашым чытачам. Але калі пра якую-небудзь кнігу для «Полымя» «акадэмічна» напіша акадэмік, мы з радасцю яго надрукуем.

Па-мойму, цяпер крытыка мала ўплывае на чытача, бо чытачы яе амаль не чытаюць, а крытыкі мала пішуць. І ўсё ж у «Полымі» ёсць рубрыка «Кнігарня», дзе аналізуюцца і рэкламуюцца кнігі, якія нядаўна выйшлі.

***— Юбілейным для «Полымя» выдаецца ўвесь год, цягам якога адбываліся рознага кшталту мерапрыемствы. Але асноўныя ўрачыстасці прымеркавалі да канца года... Як будзеце адзначаць?***

— 23 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстава «Іскрыся іскрамі, палай!», прысвечаная 100-годдзю з часу заснавання часопіса «Полымя». Выстава адлюстроўвае змест і настрой часопіса з самага першага нумара 1922 года да свежых нумароў за 2022 год. Экспазіцыя пабудавана ў храналагічным парадку па дзесяцігоддзях. Побач з часопісамі знаходзяцца выданні твораў знакамітых аўтараў, якія ўпершыню былі апублікаваны ў часопісе «Полымя». 8 снежня ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася выстава «...Ізноў на хвалі часу. Нязгасныя знічкі «Полымя», якая будзе працаваць да 25 лютага 2023 года. У СПБ пройдзе круглы стол, прысвечаны «Полымю» і яго аўтарам.

***— Раскажыце пра юбілейны нумар часопіса. Што ў ім адметнага?***

— Юбілейны нумар «Полымя» атрымаўся своеасаблівым, бо ў ім няма, як звычайна, паэзіі, прозы, літаратуразнаўчых артыкулаў. Ён распачынаецца матэрыяламі круглага стала «Гістарычная місія, адказнасць і звышзадача», прысвечанага 100-годдзю «Полымя». Па юбілейным нумары можна будзе прасачыць гісторыю часопіса з 1922-га да 2023 года і разам з гэтым паднавіць веды па гісторыі беларускай літаратуры за апошнія 100 гадоў. Нумар багата ілюстраваны рэдкімі фотаздымкамі і дакументамі.

***— Як надрукавацца ў вашым выданні, хто можа стаць аўтарам?***

—Трэба напісаць добры твор і даслаць або прынесці ў рэдакцыю. І хацелася б, каб нашы аўтары выпісвалі і чыталі «Полымя» пастаянна, а не толькі тады, калі мы іх там друкуем.

***— Неяк прачытала цікавае апытанне сярод галоўных рэдактараў літаратурных расійскіх часопісаў на тэму, як адмовіць у публікацыі сябру ці паважанаму чалавеку і не пасварыцца і што прасцей — прыняць да публікацыі няўдалы тэкст ці сапсаваць адносіны? Як адказалі б вы?***

— Пасварыцца можна з аўтарам, калі ты яму абяцаеш публікацыю, а потым не выканаеш сваё абяцанне. Словам, трэба заўсёды і ўсім аўтарам казаць праўду пра іх творы і не баяцца, што сапсуюцца адносіны. Таленавіты чалавек нават калі і пакрыўдзіцца напачатку, дык пасля зразумее, што сапраўды ў яго творы не ўсё так добра, як яму здаецца.

***— Чым парадуеце чытача ў наступным годзе?***

— У першым паўгоддзі будзем друкаваць раман Алеся Каждуба «Партрэт», новыя аповесці Раісы Баравіковай, Зіновія Прыгодзіча, Валянціны Кадзетавай, Віктара Кунцэвіча. Апавяданні Віктара Гардзея, Георгія Марчука, Таццяны Дзямідовіч, Віктара Праўдзіна і іншых. Вершы Алеся Бадака, Міколы Маляўкі, Казіміра Камейшы, Алеся Жыгунова, Людмілы Кебіч, Алеся Казекі і многіх іншых. Пералічваць можна доўга. Спадзяюся, што нашы чытачы ў кожным нумары знойдуць для сябе нешта цікавае ў кожным жанры, якія будуць там надрукаваны.

**Падрыхтавала Людміла ІВАНОВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# Генрых XIII і штурм Рэйхстага




## Чым адзначыліся «рэйхсбюргеры» ў Германіі?

**Правыя экстрэмісты, якія нібыта планавалі дзяржаўны пераварот і адраджэнне Другога рэйха, хацелі забіць канцлера ФРГ Олафа Шольца. Аб гэтым паведаміла газета New York Times са спасылкай на крыніцы, знаёмыя з ходам расследавання. Як сцвярджае нямецкая контрразведка, змоўніцкая групоўка «Грамадзяне Рэйха» (Reichsburger) меркавала стварыць 286 узброеных груп, якія павінны былі «адказваць за ўнутраную бяспеку» па ўсёй краіне і праводзіць «зачысткі», не спыняючыся нават перад забойствамі. New York Times піша, што было знойдзена больш за 100 дакументаў аб неразгалошванні, у якіх удзельнікі змовы кляліся захаваць інфармацыю аб планах групы зрынуць існуючы ў Германіі дзяржаўны лад і замяніць яго на ўласную форму праўлення. Відавочна, што ў гэтай справе шмат нестыковак. Чым жа насамрэч адзначыліся «рэйхсбюргеры» ў Германіі і чаму яны «ўсплылі» менавіта цяпер?**

### Мячы, шлемы, пісталеты

Днямі нямецкія ўлады агучылі справаздачу аб прадухіленні дзяржаўнага перавароту, мэтай якога была не толькі змена ўлады, але і змена дзяржаўнага ладу ФРГ. У маштабнай аперацыі па адлове змоўшчыкаў прынялі ўдзел тры тысячы паліцэйскіх, якія правяліператрусы і затрыманні па 130 адрасах у 11 землях з 16 толькі ў Германіі, а таксама ў Аўстрыі і Італіі. Міністр юстыцыі ФРГ Марк Бушман паведаміў аб паспяховым правядзенні «антытэрарыстычнай аперацыі». «Федэральная пракуратура праводзіць следчыя дзеянні ў дачыненні да тэрарыстычнай сеткі з асяроддзя «рэйхсбюргераў». Ёсць падазрэнне, што на канстытуцыйныя органы ўлады планаваўся ўзброены напад», — напісаў ён у сацсетцы.



Аднак «улоў» выглядае сціпла: усяго 25 затрыманых, з іх толькі восем арыштаваны, і распачата следства. Хутчэй за ўсё, 17 затрыманых былі адпушчаныя на волю без прад'яўлення абвінавачання. Яшчэ паліцыя паведаміла, што 27 чалавек «знаходзяцца пад падазрэннем». Што далі ператрусы па астатніх прыкладна ста адрасах, улады не паведамляюць. Магчыма, змоўшчыкаў не было дома ці паліцэйскія памыліліся адрасам.

Пры дэталёвым разглядзе паведамленняў аб «паспяховай спецаперацыі» ўзнікае шмат пытанняў, заўважае expert.ru. Невядома, хто насамрэч стаіць за адназначна аперэтачнай ідэяй захопу Бундэстага. «Да гэтага часу ўсе падпалы Рэйхстагаў і штурмы Капітолія былі выдатна зрэжысіраваны зусім не тымі, хто рабіў усю чорную працу», — адзначыў расійскі тэлеканал «ТБЦ».

Як запэўніваюць улады, сярод арыштаваных апынуўся кіраўнік арганізацыі, які павінен быў стаць кіраўніком новага Рэйха: 71-гадовы Генрых XIII з дваранскага роду Ройсаў, чый прадзед быў уладаром невялікага княства ва Усходняй Германіі. Сам Ройс называе сябе ў інтэрнэце прынцам і залічвае да прамых нашчадкаў уладальнага дома, які кіраваў на тэрыторыі сучаснай нямецкай зямлі Цюрынгія. Была арыштавана і 39-гадовая грамадзянка Расіі: яна, паводле інфармацыі нямецкіх журналістаў, з'яўляецца спадарожніцай жыцця Генрыха XIII.

Былі затрыманы таксама колішні член парламента ад партыі «Альтэрнатыва для Германіі» (АдГ) 58-гадовая Біргіт Мальсак-Вінкеман і неназваны суддзя з Берліна. Таксама сярод затрыманых — знакаміты шэф-кухар, чыя дачка з'яўляецца сяброўкай футбаліста мадрыдскага «Рэала» Давіда Алабы, і былы афіцэр паліцыі, якому калісьці было даручана абараняць яўрэйскія абшчыны ад тэрарыстычных нападаў. Паведамлялася, што многія з арыштаваных нібыта з'яўляюцца колішнімі або дзейнымі вайскоўцамі.

Паводле звестак часопіса Der Spiegel, сярод прадметаў, канфіскаваных падчас маштабнай паліцэйскай спецаперацыі, былі 9-міліметровыя пісталеты, мячы, нажы, электрашокеры, баявыя шлемы, прыборы начнога бачання і службовая зброя паліцэйскага і жанчыны-паліцэйскага, якія аказаліся сярод падазраваных.

### «Не забыць шапку: у Берліне холадна»

Хоць Генрых XIII у свой час служыў у войску, вельмі сумнеўна, каб ён, яго грамадзянская жонка, 58-гадовая былая дэпутатка Бундэстага і суддзя з Берліна асабіста штурмавалі шматлікія органы ўлады ў сталіцы Германіі. Застаецца думаць, што ўдарны кулак змоўшчыкаў складаўся з чатырох вайскоўцаў, частка з якіх ужо знаходзілася на пенсіі. Або давядзецца выказаць здагадку, што паліцыя не прад'явіла абвінавачанне астатнім затрыманым баевікам, якія рыхтаваліся сілай зрынуць існуючы лад.

Затрыманне грамадзянкі Расійскай Федэрацыі не было скарыстана нямецкімі ўладамі для абвінавачання Масквы ў арганізацыі перавароту або ўдзеле ў ім. Улады ФРГ паведамілі, што падазроныя ў падрыхтоўцы захопу ўлады нібыта звязваліся з прадстаўнікамі Расіі, але не атрымалі чаканай падтрымкі. У Крамлі назвалі змову ўнутранай праблемай ФРГ. «Яны самі канстатуюць, што ні пра якое ўмяшанне Расіі гаворкі ісці не можа», — заўважыў прэс-сакратар Прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў.

А вось арышт члена партыі «Альтэрнатыва для Германіі» (АдГ) можа пацягнуць за сабой наступствы для гэтай палітычнай сілы. «Вельмі правая партыя», якая раней заяўляла аб неабходнасці паляпшэння адносін з Расіяй і скарачэння прытоку мігрантаў у краіну, які практычна не кантралюецца ўладамі, магчыма, будзе вымушана стаць больш «умеранай». «Аднаўленне кантролю за доступам у Бундэстаг былых дэпутатаў ад АдГ з'яўляецца неабходнасцю пасля выкрыццяў вакол Мальсак-Вінкеман», — заявіў намеснік парламенцкага лідара фракцыі лібералаў Канстанцін Кюле, заклікаўшы сілы бяспекі не дапускаць нікога, каго яны лічаць патэнцыянальнай пагрозай бяспекі.




«Гэтая змова выглядае вельмі камічна, і большасць немцаў над усёй гэтай гісторыяй адкрыта пацяшаецца, — заўважыў тэлеканал «ТБЦ». — У сеціве нават распаўсюджваюць жартаўлівую запіску. Па меркаванні тых, хто яе склаў, менавіта так павінен быў выглядаць план змоўшчыкаў: «1) паехаць у Берлін; 2) узяць штурмам Рэйхстаг; 3) стварыць новы ўрад са мной на чале ў якасці канцлера; 4) білет купляць толькі за наяўныя; 5) не забыць узяць шапку: у Берліне холадна».

### Час фрыкаў

Генрых Ройс ніколі не хаваў свае вельмі правыя погляды і нават выступаў з лекцыямі на гэтую тэму. Нядзіўна, што вакол такой каларытнай постаці сфарміравалася змова і падпольная арганізацыя, якая, мяркуючы па ўсім, складаецца ў асноўным з членаў разнастайных германскіх спецслужбаў. Ройс ужо заяўляў публічна аб сваёй прыхільнасці тэорыям змовы, паведаміла нямецкая газета Frankfurter Rundschau. Паводле даных выдання, на мерапрыемстве Worldwebforum, якое прайшло ў 2019-м у Цюрыху, у сваёй прамове ён заявіў, што яго сям'я мела істотны ўплыў на працягу тысячы гадоў, але пасля была пазбаўлена правоў і ўласнасці. Аднак цяпер, праз 30 гадоў пасля здарэння, паводле слоў Ройса, ён знайшоў прычыну падзей і войнаў, якія абцяжарвалі грамадства. Тады ён згадаў Ротшыльда, які, на думку «прынца», кантраляваў паток брытанскіх грошай і імперыю і, такім чынам, меў вырашальны ўплыў. Таксама, паводле яго слоў, Першая сусветная вайна была справакавана замежнымі масонамі, а Германія не з'яўляецца суверэннай дзяржавай з 8 мая 1945 года.

«Выклікае неабходнасць вырашэнне пытанняў, звязаных з дабрабытам нямецкага народа. Тое, што, у прынцыпе, сённяшні ўрад дынамічна вырашыць не можа. Таму і ўзнікаюць такія гістарычныя фрыкі, якія вырашаюць гэтыя праблемы па-свойму, па-старому: захапіць Бундэстаг, арыштаваць урад, стварыць роты абароны радзімы і змяніць дзеючы дэмакратычны лад на недэмакратычны: той, які ў свой час зрабіў Германію вялікай. Як яны лічаць», — патлумачыў тэлеканалу «ТБЦ» загадчык кафедры паліталогіі і сацыялогіі Расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя Пляханава Андрэй Кошкін.

### Ролевая гульня

«Сітуацыя вельмі дзіўная, асабліва ў тым кантэксце, што рэйхсбюргеры — гэта сеткавы нефармальны рух у Германіі, ён вельмі дэзынтэграваны, у яго няма адзінага кіруючага цэнтра. Уласна кажучы, гэтым тэрмінам завецца сукупнасць дробных груп інтэлектуалаў і прадпрымальнікаў, хто не ўспрымае ФРГ як легітымную структуру і лічыць яе нават не дзяржавай, а карпарацыяй ці тэрыторыяй, акупаванай Злучанымі Штатамі. Рэйхсбюргераў аб'ядноўвае непрыманне цяперашняй дэмакратычнай сістэмы краіны, яны вельмі адмоўна ставяцца да такіх з'яў, як глабалізацыя, масавая міграцыя ў Германію, сяброўства краіны ў НАТА, гэта значыць, фактычна такія ўльтрасуверэністы. Ужо некалькі гадоў яны знаходзяцца ў полі зроку нямецкіх праваахоўных органаў. Яшчэ гадоў пяць-шэсць таму, напрыклад, ведамства па ахове канстытуцыі ў сваіх справаздачах іх ніяк не згадвала, але ў святле падзей, звязаных з рухамі «Пегіда», «Хугеза», масавых пратэстаў насельніцтва супраць незаконнай міграцыі, рэйхсбюргеры сталі больш актыўныя. У іх ёсць шэраг інтэлектуальных цэнтраў, напрыклад Германскі калегіум, Deutsch Kollegium, які распрацоўвае тэарэтычную базу ўсяго руху. Але, па сутнасці, у адрозненне ад іншых праварадыкальных арганізацый, гэта палітычная калятусоўка, якая больш нагадвае ролевую гульню, чым рэальную палітыку», — адзначыў fontanka.ru вядучы навуковы супрацоўнік Цэнтра германскіх даследаванняў Інстытута Еўропы РАН Аляксандр Камкін.

Як лічыць эксперт, спецаперацыя «вельмі падобная на правакацыю спецслужбаў з мэтай закручвання гаек, магчыма, занясенне змен у заканадаўства па забароне любых масавых дэманстрацый, плюс пад удар трапляе «Альтэрнатыва для Германіі», таму што зараз мусіруецца тэма сувязяў яе членаў з дадзеным гуртком». «Усё гэтае шоу, увесь гэты балаган са змовай гэта ўсё, вядома ж, з аднаго боку адцягнуць насельніцтва ад важных праблем. З іншага боку, спроба заткнуць рот апазіцыі», — заўважыў tvzvezda.ru дэпутат Бундэстага ад партыі «Альтэрнатыва для Германіі» Яўген Шміт.

### Дэфіцыт крывянкі

Пакуль насамрэч больш пытанняў, чым адказаў. «Вельмі «своечасова» ўсё адбылося, — заўважыў Аляксандр Камкін. — Зразумела, што нямецкае грамадства вельмі моцна падзеленае ў кантэксце апошніх падзей і сапраўды наспяваюць буйныя акцыі пратэсту. Таму, відаць, вырашылі згуляць на апярэджанне і папалохаць лаяльных бюргераў пагрозай чарговай сутычкі».

Нямецкія «змоўшчыкі» маюць рацыю ў тым, што ФРГ не валодае суверэнітэтам на сваёй зямлі, рашэнні прымаюць ЗША. Такое меркаванне выказаў намеснік кіраўніка Савета бяспекі РФ Дзмітрый Мядзведзеў у сваім тэлеграм-канале. «Рашэнні па пытаннях нямецкай энергетыкі, прамысловасці і абароны прымае «глыбінная амерыканская дзяржава», — заўважыў ён. Іранізуючы над палітычнай сітуацыяй у Германіі, Дзмітрый Мядзведзеў напісаў, што «ў немцаў відавочна назіраецца дэфіцыт крывянай каўбасы, усюды толькі ліверная». На яго думку, канцлеру ФРГ Олафу «Шольцу такі разварот відавочна на карысць». «Ён і повар, і ўдзельнік трапезы», — заўважыў расійскі палітык.

Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў і намёкі на сувязь «змоўшчыкаў» з рускімі. «А як інакш? Усе зламысныя змовы, сусветныя войны, разбуральныя землятрусы і смяротныя эпідэміі ад нас. Ганарымся, хоць у нас і не выйшла пакуль. Будзем спрабаваць на трываласць Германію і надалей. Раптам зноў стане манархіяй?» — саркастычна пракаментаваў ён. Сітуацыю, якая склалася, Дзмітрый Мядзведзеў назваў «яўнай прыкметай спадчыннай хваробы ўсёй мадэлі кіравання ў Германіі». Ён дадаў, што «гэта чыстая правакацыя і канспіралогія», і выказаў меркаванне, што «трылер будзе цікавейшы за праславуты нямецкі серыял Dark».

**Захар БУРАК.**

### ❍ Тым часам

#### У Францыі затрымалі ўзброеную групу, якая накіроўвалася да Елісейскіх Палёў

У Парыжы супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі ўзброеную групу з 40 чалавек, якая накіроўвалася да Елісейскіх Палёў. Аб гэтым паведаміў ТАСС са спасылкай на Agence France-Presse.

Адзначаецца, што сярод затрыманых былі ўдзельнікі руху, які па сваіх поглядах блізкі да ўльтраправага. Пакуль ім прад'яўлена абвінавачанне ў незаконным нашэнні зброі. У паліцыі таксама паведамілі, што затрыманыя мелі намер учыніць бойку на Елісейскіх Палях.

Як вядома, днямі ў некалькіх французскіх гарадах адбыліся масавыя беспарадкі пасля матча чэмпіянату свету па футболе, у выніку якога зборная Францыі атрымала перамогу над камандай з Марока з лікам 2:0. Паліцыі прыйшлося прымяніць слёзатачывы газ.

# Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ГИРЛЯНДА ДОБРА»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Гирлянда добра» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Гирлянда добра» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Брэнд-Мэйд», УНП 190638310, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением № 1216 от 14 июля 2005 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190638310.

Республика Беларусь, 220062, г. Минск, ул. Немига, д. 5, пом. 53.

**2. Заинтересованное лицо Рекламной игры.**

Заинтересованным лицом Рекламной игры является СООО «Мобильные ТелеСистемы» (далее – МТС), УНП 800013732.

Республика Беларусь, 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95-4.

**3. Участники Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут быть физические лица – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, являющиеся либо ставшие абонентами МТС в период проведения Рекламной игры и выполнившие все условия участия в Рекламной игре.

Абонентом для целей настоящих Правил и проведения Рекламной игры является пользователь услуг сотовой подвижной электросвязи, предоставляемых по договору, заключенному между МТС и его клиентом, которому выделен абонентский номер.

Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства; лица, состоящие в трудовых отношениях с МТС, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**4. Наименование Рекламной игры: «Гирлянда добра».**

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Срок начала Рекламной игры:** 20 декабря 2022 года.

**7. Срок окончания Рекламной игры:** 24 февраля 2023 года.

**8. Наименование товаров (работ, услуг), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования использования услуг электросвязи МТС.

**9. Призовой фонд Рекламной игры.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица в размере **79 010,51 (семьдесят девять тысяч десять) белорусских рублей 51 копейка.** Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:

***Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры.***

| № | Наименование | Наименование в Правилах | Кол-во, шт. | Стоимость за шт., бел. рублей | Всего, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048582992306 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 1 | 1 | 3 408,05 | 3 408,05 |
| | денежные средства | | | 587,04 | 587,04 |
| 2 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048582992363 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 2 | 1 | 3 408,05 | 3 408,05 |
| | денежные средства | | | 587,04 | 587,04 |
| 3 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495879 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 3 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 4 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496703 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 4 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 5 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496141 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 5 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 6 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496752 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 6 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 7 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496851 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 7 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 8 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496695 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 8 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 9 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495705 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 9 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 10 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495721 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 10 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 11 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496406 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 11 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 12 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496778 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 12 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 13 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495630 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 13 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 14 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495341 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 14 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 15 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495465 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 15 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 16 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495440 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 16 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 17 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583496810 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 17 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 18 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495119 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 18 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 19 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495929 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 19 | 1 | 3 366,05 | 3 366,05 |
| | денежные средства | | | 579,51 | 579,51 |
| 20 | Код: 0000051544, SAMSUNG S908 256GB Black, IMEI: 350048583495275 /Страна происхождения: Вьетнам/ | Смартфон 20 | 1 | 3 366,26 | 3 366,26 |
| | денежные средства | | | 579,55 | 579,55 |
| | **ИТОГО** | | | | **79 010,51** |

**10. Порядок участия в Рекламной игре.**

**10.1.** Для участия в Рекламной игре необходимо:

**10.1.1.** В период с 08:00:00 20.12.2022 по 23:59:59 08.01.2023 включительно являться либо стать абонентом МТС;

**10.1.2.** В период с 08:00:00 20.12.2022 по 23:59:59 08.01.2023 включительно зарегистрироваться на интернет-сайте www.2023.mts.by (далее – «Сайт»), заполнив регистрационную форму на русском языке, содержащую следующие данные:

- фамилию (обязательно), имя собственное (обязательно), отчество (обязательно, если таковое имеется) абонента;
- дату рождения абонента (обязательно);
- номер мобильного телефона МТС абонента «+375XXXXXXXXX» (обязательно);
- адрес электронной почты абонента (при наличии).

Также Участнику необходимо на Сайте путем проставления соответствующих галочек при заполнении регистрационной формы подтвердить согласие на участие в Рекламной игре, ознакомление с настоящими Правилами, ознакомление с тем, что Организатор с привлечением Заинтересованного лица будет обрабатывать персональные данные Участника для целей проведения Рекламной игры.

При регистрации на Сайте Участник не должен иметь задолженность по оплате услуг электросвязи, если данные услуги предоставляются на условиях предоплаты.

**10.1.3.** На момент 09.01.2023 12.00 являться абонентом МТС по указанному при регистрации в Рекламной игре абонентскому номеру сотовой подвижной электросвязи МТС, не имея блокировок на данном абонентском номере.

**10.2.** Участник может столько раз принять участие в Рекламной игре, сколько у Участника имеется договоров, заключенных с МТС, по которым выделены абонентские номера.

**10.3.** Организатор не несет ответственности за ошибки, допущенные Участником при заполнении данных при регистрации на Сайте.

**11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших Участников Рекламной игры:**

**11.1.** Розыгрыш призов проходит по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 16, корп. 4, 2-й этаж, в соответствии с датой и временем, указанными в Таблице 2.

Розыгрыш призов проводится открыто, с возможностью присутствия Участников Рекламной игры.

***Таблица № 2. Розыгрыш призов:***

| Дата и время розыгрыша | Период регистрации Участника на Сайте | Призы для розыгрыша |
|---|---|---|
| **13.01.2023 в 14.00** | **С 08:00:00 20.12.2022 по 23:59:59 08.01.2023** | Смартфон 1 – 1 шт.<br>Смартфон 2 – 1 шт.<br>Смартфон 3 – 1 шт.<br>Смартфон 4 – 1 шт.<br>Смартфон 5 – 1 шт.<br>Смартфон 6 – 1 шт.<br>Смартфон 7 – 1 шт.<br>Смартфон 8 – 1 шт.<br>Смартфон 9 – 1 шт.<br>Смартфон 10 – 1 шт.<br>Смартфон 11 – 1 шт.<br>Смартфон 12 – 1 шт.<br>Смартфон 13 – 1 шт.<br>Смартфон 14 – 1 шт.<br>Смартфон 16 – 1 шт.<br>Смартфон 17 – 1 шт.<br>Смартфон 18 – 1 шт.<br>Смартфон 19 – 1 шт.<br>Смартфон 20 – 1 шт. |

**11.2.** Для осуществления розыгрыша призов формируется Список, в котором Организатор присваивает Номера участника для розыгрыша призов в хронологическом порядке согласно дате и времени регистрации Участника на Сайте. В случае совпадения у нескольких Участников даты и времени регистрации на Сайте Номера участника присваиваются по фамилии, имени собственному и отчеству (если таковое имеется) Участника по алфавиту.

Все Номера участников в розыгрыше призов имеют одинаковую разрядность.

**11.2.1.** Список для розыгрыша призов содержит следующую информацию: Номер участника, фамилию, имя собственное, отчество (если таковое имеется) Участника, адрес электронной почты (e-mail) (при наличии), номер телефона Участника, дату рождения, дату и время регистрации на Сайте.

**11.3.** Для проведения розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) до 9 (девяти). Определение выигрышных Номеров участников происходит путем их формирования слева направо из цифр на шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

**11.3.1.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного Номера участника в лототрон помещаются шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в Списке. Из лототрона извлекается один шар. Цифра на шаре вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного Номера участника.

**11.3.2.** После этого в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, который определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах Номеров участников. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного Номера участника – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, а извлекается следующий шар до получения нужного совпадения.

**11.3.3.** Шары извлекают до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов Номеров участников в Списке. Таким образом формируются все выигрышные Номера участников – Победителей призов.

**11.3.4.** Каждый Участник может выиграть только 1 (один) приз в рамках Рекламной игры, вне зависимости от количества абонентских номеров, зарегистрированных на Сайте. В случае если выигрышный Номер участника принадлежит Участнику, уже ставшему Победителем приза, то определение выигрышного Номера участника начинается заново.

**11.4.** При проведении розыгрыша после определения всех Победителей дополнительно определяются по одному резервному победителю для каждого приза. Резервным победителем становится следующий за выигрышным по Списку Номер участника, принадлежащий другому Участнику.

В случае если Номер участника резервного победителя принадлежит основному Победителю приза или Участнику, уже ставшему резервным победителем приза, то выигрышным становится следующий после него первый Номер участника иного Участника.

**11.5.** Результат розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрыша, который подписывается присутствующими на заседании членами комиссии по проведению Рекламной игры.

**12. Порядок уведомления Победителей о результатах розыгрышей, порядок получения выигрышей.**

**12.1.** Организатор не позднее 20.01.2023 уведомляет Победителей о выигрыше посредством телефонных звонков и/или смс-сообщением по номерам мобильных телефонов, указанным при регистрации на Сайте. Дополнительно Организатор может уведомлять Победителей о выигрыше путем направления извещения по электронной почте, в случае ее указания Победителями при регистрации на Сайте.

**12.2.** Для получения призов Победителям после уведомления о выигрыше необходимо прибыть в офис Организатора по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 5, пом. 53. не позднее 17.02.2023 по рабочим дням с 10.00 до 18.00 или в субботу 04.02.2023 с 11.00 до 14.00. При себе Победителю необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (паспорт/ ID-карта/вид на жительство в Республике Беларусь/удостоверение беженца), для предъявления Организатору и использования данных при оформлении необходимых документов в рамках Рекламной игры. Копии данных документов Организатор оставляет у себя.

**12.3.** Приз не вручается основному Победителю, а вручается резервному Победителю в случае, если основной Победитель:

**12.3.1.** отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

**12.3.2.** нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые документы, либо не является за получением приза в сроки и в порядке, установленные пунктом 12.2 Правил;

**12.3.3.** не выходит на связь с Организатором (невозможность получения уведомлений Организатора из-за неактуальных сведений при регистрации на Сайте).

**12.4.** Резервные Победители, которым перешло право на получение приза, уведомляются об этом не позднее 20.02.2023, в порядке, предусмотренном пунктом 12.1 Правил.

Резервные Победители должны выполнить действия, перечисленные в пункте 12.2 Правил, не позднее 24.02.2023. Призы будут выданы резервным Победителям не позднее 24.02.2023.

В случае если резервный Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Невостребованные призы после окончания Рекламной игры возвращаются Заинтересованному лицу.

**12.5.** Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности. В случае если Победителем становится несовершеннолетний Участник, приз выдается его законному представителю.

**12.6.** Призы не подлежат замене. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**12.7.** При получении всех призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляется Организатором. Удержание с Победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи призов из денежной части призов (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры.**

**13.1.** Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, отбора Участников, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Гниломедова Юлия Леонидовна, начальник управления маркетинговых коммуникаций СООО «Мобильные ТелеСистемы»;
2. Козловский Кирилл Игоревич, ведущий экономист по финансовой работе отдела коммерческого контроллинга и ценообразования СООО «Мобильные ТелеСистемы»;
3. Марзалюк Юлия Александровна, начальник отдела медиа управления маркетинговых коммуникаций СООО «Мобильные ТелеСистемы»;
4. Полидовец Светлана Викторовна, руководитель проекта отдела поставок терминального оборудования и маркетинговых услуг СООО «Мобильные ТелеСистемы»;
5. Позник Александра Александровна, специалист по маркетингу ООО «Брэнд-Мэйд».

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

**14.1.** Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

**14.2.** Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 23.02.2023 включительно.

**14.3.** Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Сайте, а также по телефону горячей линии +375173887889 с 10.00 до 20.00 без выходных.

**15. Прочие условия.**

**15.1.** Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

**15.2.** Участники Рекламной игры, претендующие на получение призов, обязуются предоставить все необходимые документы для получения призов.

**15.3.** Организатор не несет ответственности, если не по его вине у Участника отсутствует доступ к сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет), за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оконечным абонентским устройством Участника и т. д.), почтовой службы (сроки доставки уведомлений и т. д.). Организатор не компенсирует Участнику расходы, связанные с оплатой транспортных расходов при посещении Организатора для получения приза.

**15.4.** Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае неактуальной информации, предоставленной Участником.

**15.5.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

**15.6.** Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по почтовому адресу: Республика Беларусь, 220062, г. Минск, ул. Немига, д. 5, пом. 53.

*Свидетельство № 4268 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 12 декабря 2022 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі

З 1980 года БСГА ўзначаліў акадэмік УАСГНІЛ, доктар тэхнічных навук, прафесар Сяргей Іванавіч Назараў. Якія імёны! Якое шматаблічча навуковых зацікаўленняў рэктараў сельгасакадэміі! Прафесар Назараў быў буйным вучоным у галіне механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Яго імя таксама да гэтага часу ў акадэміі вымаўляюць з павагай. У 1992 годзе Сяргей Іванавіч перадаў лейцы кіравання БСГА свайму вучню, члену-карэспандэнту Нацыянальнай акадэміі навук, доктару тэхнічных навук Вячаславу Аляксеевічу Шаршунову. Новаму рэктару давялося няпроста. У гэтыя гады стары ўклад жыцця разваліўся, а новы давялося вызначаць наноў. Вячаслаў Аляксеевіч цвёрда стаяў на тым, што Горацкую аграрную акадэмію трэба было, чаго б гэта ні каштавала, не толькі захаваць у поўным маштабе, але і дамагацца яе развіцця ў сучасных, няхай сабе і няпростых, умовах. Рэктар сваю пазіцыю выкладаў усім адкрыта і аргументавана: і ў часіны ліхалецця людзей трэба карміць, зямлю апрацоўваць, кароў даіць. Вёска павінна быць забяспечана спецыялістамі. Так было ва ўсе часы, і акадэмія гэта робіць ужо амаль дзвесце гадоў. Ён разумеў, што трэба не толькі захаваць традыцыйныя спецыяльнасці, але і адкрываць запатрабаваныя ўжо іншым укладам жыцця, з улікам перспектыў сельскай гаспадаркі ў новых умовах: маркетынг, прававое забеспячэнне аграбізнесу, фінансы і крэдыт, конегадоўля, рыбная лоўля, біятэхналогіі. І дзеля гэтага патрабуюцца выкладчыкі і жыллё для іх, навуковае і вучэбнае абсталяванне, новыя інтэрнаты для студэнтаў — а гэта грошы, грошы, грошы. У цяжкія дзевяностыя іх не толькі не даюць, але і адабраць могуць! Рэктару даводзіцца даказваць, што сталовая, паліклініка, лазня ў акадэміі — гэта не прымхі рэктара, а жыццёва важныя для акадэміі аб'екты.

Людзі паважалі і падтрымлівалі свайго кіраўніка, давяралі яму. Бацькі, тата-франтавік, які ўсё жыццё адпрацаваў механікам на малочна-кансервавым камбінаце, і мама, настаўніца рускай мовы, выхавалі ў сваім сыне павагу да людзей, адказнасць за даручаную справу, настойлівасць у дасягненні пастаўленых задач. Таму рэктара акадэміі маглі ўгледзець у час размовы з людзьмі на кафедры і ў гаражы, у лабараторыі і на доследных участках, у студэнцкім інтэрнаце і на вуліцы ў Горках. Нядзіўна, што яго выбралі ад гэтага рэгіёна ў 1996 годзе дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання, а пасля дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 1-га склікання. Вячаслаў Аляксеевіч як рэктар стаў вельмі прыкметнай і аўтарытэтнай фігурай не толькі ў Магілёўскай вобласці, але і ў краіне, таму яго запрасілі ў Міністэрства сельскай гаспадаркі ўзначаліць галоўнае ўпраўленне кадраў і аграрнай адукацыі. Кіраванне акадэміяй ён перадаў свайму першаму прарэктару, доктару сельскагаспадарчых навук, прафесару Аляксандру Рымавічу Цыганову.

Пра Шаршунова ў час яго рэктарства я быў не болей чым начуты, бо толькі стаў прарэктарам па вучэбнай рабоце ў сваім пядінстытуце, стварыў вучэбны комплекс для вывучэння практычнай рэалізацыі ідэй бесперапыннай адукацыі, завяршаў работу над доктарскай дысертацыяй — кіраўнікі іншых ВНУ мяне мала цікавілі, іх узровень падаваўся для мяне недасяжным. Блізка з Вячаславам Аляксеевічам мы сышліся пазней. А вось з Аляксандрам Рымавічам як першыя прарэктары разам прыехалі на курсы павышэння кваліфікацыі ў РІВШ. Там і пасябравалі. У тым, 1995 годзе, мы абодва выходзілі на абарону доктарскіх дысертацый, па розных навуковых спецыяльнасцях, але працэдура ж тая самая. Нам было пра што пагаварыць і нават пашаптацца.

Аляксандр Рымавіч — вучоны-хімік у шостым пакаленні. Яго бацькі — дацэнты БСГА, але сам ён закончыў хімфак БДУ, там і аспірантуру, выкладаць пачаў у гэтым самым універсітэце. Але... пацягнула ў мясціны, дзе нарадзіўся, і ўжо з 1981 года — выкладчык, загадчык кафедры, першы прарэктар, а з 1995-га — рэктар Горацкай акадэміі. Пасля рэктара Шаршунова працягнуў развіццё БСГА і актыўна займаўся навуковымі вышукамі. Галіна яго даследаванняў — аграхімія, ён распрацоўваў экспрэсіўныя метады і методыкі аналізу якасці сельскагаспадарчай прадукцыі і аб'ектаў навакольнага асяроддзя, прыёмы атрымання экалагічна чыстай прадукцыі раслінаводства. А гэта ж так важна, калі навуковыя зацікаўленні рэктара адпавядаюць профілю яго ВНУ! Аляксандр Рымавіч па гэтай тэматыцы абараніў доктарскую дысертацыю, стаў прафесарам, яго выбралі членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук, у БСГА сфарміравалася яго навуковая школа, за комплекс вучэбных дапаможнікаў па аграхіміі ў 2002 годзе ён быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй. Тым самым, як і яго папярэднікі-рэктары, Цыганоў таксама стаў прыкметны ў маштабе краіны, і яму ў 2008 годзе прапанавалі пасаду намесніка старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.

У васьмідзясятыя гады сярод магілёўскіх ВНУ праводзілася штогадовая спартакіяда для выкладчыкаў: лёгкая атлетыка, валейбол, шахматы. Яе арганізатарамі выступалі па чарзе ўсе чатыры ВНУ, але ў Магілёве яна праходзіла не так цікава, як у Горках. Туды ўсе каманды выязджалі на два дні. Вечарам горацкія калегі абавязкова наладжвалі прыём. Спартыўныя спаборніцтвы пераўтвараліся ў сапраўднае свята. Падобна, уражанні, якія склаліся ў тыя гады ад БСГА, засталіся ў мяне надоўга — ужо на пасадзе міністра адукацыі я ехаў у Горкі ў такім самым прыўзнятым настроі.

Аляксандр Рымавіч заўсёды імкнуўся паказаць якасць працы сваёй ВНУ найперш праз поспехі выпускнікоў. На адным з юбілеяў акадэміі ён папрасіў выйсці на сцэну старшынь райвыканкамаў, якія закончылі БСГА, і яны там запаланілі ўсю прастору.

Ужо як з рэктарам акадэміі з Аляксандрам Рымавічам я стаў бачыцца часцей. І хоць БСГА была ў структуры Мінсельгасхарча, у Міністэрстве адукацыі ён быў часты госць. І не толькі на афіцыйных мерапрыемствах. Нам было цікава пагутарыць і разам. Мне спадабалася ў развагах Цыганова грунтоўнасць, логіка, дасведчанасць па многіх пытаннях як адукацыі, так і ўвогуле развіцця жыцця ў краіне. Пасля яго пераходу ў НАН мы пачалі бачыцца яшчэ часцей — я ў гэты час ужо працаваў першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, а ён у Акадэміі навук курыраваў пытанні ідэалогіі (а яшчэ і будаўніцтва) — тэмы нашых гутарак пашырыліся істотна. Выбары ў члены Акадэміі навук заўсёды суправаджаюцца напружаннямі паміж яе аддзяленнямі, навуковымі школамі і акадэмікамі, але Аляксандра Рымавіча ў сапраўдныя члены выбралі без усялякіх размоў і замінак. Аднак паміж акадэмічнай і ўніверсітэцкай сферамі заўсёды ёсць прыкметнае саперніцтва, таму выхадцу з універсітэцкага асяроддзя ў Акадэміі навук заўсёды будзе не зусім утульна, як і наадварот. Таму і акадэмік Цыганоў вярнуўся да звыклай для сябе працы: цяпер ён першы прарэктар Беларускага тэхнічнага ўніверсітэта.

Пасля акадэміка Цыганова ў 2008-м БСГА ўзначаліў доктар ветэрынарных навук, прафесар Аляксандр Паўлавіч Курдэка, прарэктар па навуковай рабоце Віцебскай ветэрынарнай акадэміі. Новаму рэктару давялося не толькі працягваць развіццё БСГА, але і разам з усім калектывам уключыцца ў падрыхтоўку да рэспубліканскага свята «Дажынкі» ў 2012 годзе. На гэтую ўрачыстасць з нагоды заканчэння ўборачных работ па традыцыі збіраліся перадавікі сельскай гаспадаркі з усёй краіны, свята адкрываў Прэзідэнт, ён жа ўручаў узнагароды і каштоўныя падарункі найлепшым камбайнерам, аграномам, кіраўнікам сельгаспрадпрыемстваў. Горкі, як і ўсе гарады, дзе праходзілі «Дажынкі», рыхтаваліся да прыёму гасцей загадзя. Трэба было навесці ідэальны парадак ва ўсіх арганізацыях і гаспадарках раёна, добраўпарадкаваць у горадзе вуліцы і двары, упрыгожыць яго, падрыхтаваць цэнтральную плошчу да шматтысячнага ўрачыстага сходу і канцэрта. А ў Горках увогуле вырашылі ўзвесці прасторны амфітэатр. І выкладчыкі, і студэнты ўключыліся ў работу па падрыхтоўцы «Дажынак», на яе адводзілі ўвесь вольны час. Але ўзамен акадэмія капітальна адрамантавала свае вучэбныя карпусы і інтэрнаты, атрымала сучаснае вучэбнае абсталяванне і... навюткі амфітэатр. Рэктар Курдэка справіўся з пастаўленымі перад яго калектывам задачамі, але... усё ж цягнула да сябе назад яго родная ветэрынарная акадэмія. У 2014 годзе ён паехаў туды загадваць кафедрай.

Я памятаю, як у 2014 годзе да мяне ў Адміністрацыю Прэзідэнта на ўзгадненне перад прызначэннем рэктарам БСГА прыйшоў першы прарэктар гэтай акадэміі, кандыдат сельскагаспадарчых навук Павел Аляксандравіч Саскевіч. Я яго добра ведаў, не сумняваўся ў тым, што гэта вартая кандыдатура на рэктара, але ўсё ж сказаў яму:

— Горацкая акадэмія — самая першая на тэрыторыі Беларусі свецкая навучальная ўстанова. Рэктарамі там працавалі не проста дактары навук — навуковыя светачы. Таму, паважаны Павел Аляксандравіч, я не супраць вашага прызначэння, але хачу папярэдзіць: станеце доктарам навук — будзеце сапраўдным рэктарам акадэміі, не — будзеце ім толькі лічыцца.

Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне Паўла Аляксандравіча рэктарам. А праз год ён да мяне прыехаў і расказаў:

— Пасля нашай размовы перад маім прызначэннем я тры ночы не спаў. Вы праўду казалі! Рэктар — навуковы лідар! Для доктарскай дысертацыі ў мяне быў немалы наробак, але давялося моцна напружыцца. Дакладваю: я абараніўся!

Прафесар Саскевіч працаваў рэктарам БСГА да 2019 года. Пасля яго кіраўніком акадэміі быў прызначаны прарэктар Віцебскай ветэрынарнай акадэміі, кандыдат ветэрынарных навук, дацэнт Віталь Віктаравіч Веліканаў. Гісторыя паўтараецца: Віталь Віктаравіч — выхаванец ветэрынарнай акадэміі, і абарона доктарскай дысертацыі ў яго наперадзе.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 24 снежня).*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая; 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня; 13, 20, 27 жніўня; 3, 17, 24 верасня; 1, 8, 15, 29 кастрычніка, 5, 12, 26 лістапада, 3, 10 снежня.)*

## Слова пісьменніка





**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Калинковичский завод бытовой химии» (продавец) извещает о проведении 30 декабря 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 40 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** инженерные сети (электрические, водопроводные, канализационные), проходящие внутри границ приобретенного участка являются собственностью ОАО «Калинковичский завод бытовой химии». Их дальнейшее совместное использование, ремонт (включая капитальный), модернизацию, замену, демонтаж, реконструкцию, подсоединение вновь возводимых к существующим новый собственник осуществляет за свой счет по согласованию с ОАО «Калинковичский завод бытовой химии» (или его преемником). Не позднее 2 (двух) месячного срока со дня подписания договора купли-продажи новый собственник обязан установить ограждение по границам приобретенного земельного участка | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 333/С-21735** общей площадью **591,0 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **склад сырья**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21725** общей площадью **717,6 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание склада с навесом для хранения котельного топлива**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Капитальное строение с инв. № 333/С-21740** общей площадью **18,5 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание туалета**. Адрес: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В/1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **322350100003006201** общей площадью **0,5760 га (право аренды).** **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17В. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания склада сырья | **138 106,58** | 13 810,66 |

**Продавец:** ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», 247710, г. Калинковичи, ул. Чехова, 17.

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (033) 616-72-16 Чернявский Эдуард Петрович;** заключение договора купли-продажи по **тел.: 8 (029) 532-70-87 – Логвина Аксана Ивановна.**

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (ОАО «Калинковичский завод бытовой химии»):** р/с BY70 BLBB 3012 0400 0230 8000 1001, БИК BLBBBY2X, в ЦБУ № 307 ОАО «Белинвестбанк» г. Калинковичи, УНП 400023080, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 декабря 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 28 декабря 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

**Условия оплаты: оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Предоставляется рассрочка платежа в соответствии с действующим законодательством РБ.** Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 22.09.2022 г. № 186 (29808). Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»);** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

# «ГЕРОІ МАІХ ФІЛЬМАЎ ВУЧАЦЬ МЯНЕ ЛЮБІЦЬ СВАЮ ПРАФЕСІЮ»

**ПАМЯТАЕЦЕ, як пісаў Экзюперы: «Галоўнае схавана ад вока. Толькі сэрца ўсё пільна бачыць». Здольнасць паказаць сэнсы, звяртаючы на сябе позіркі шматлікіх гледачоў, і знайсці водгук у іх душах — пад сілу сапраўдным майстрам. Мой сённяшні герой, лічу, якраз з такіх. Рэжысёр, прадзюсар, тэлевядучы Сяргей КАЦЬЕР на тэлебачанні і ў кіно працуе 40 гадоў. На яго творчым рахунку больш 1500 праграм і больш за 30 дакументальных кінастужак, якія не толькі даюць аўдыторыі падставу для новых знаёмстваў і адкрыццяў на экране, але і дазваляюць глядзець на звыклае з новага ракурсу, знаходзіць глыбіню і глебу для роздуму і натхнення. Пра ўласны шлях у прафесію, пераацэнку каштоўнасцяў і пра тое, дзе адчуваеш сябе па-сапраўднаму дома, Сяргей Кацьер распавёў пры сустрэчы.**



## Паказаць гледачу ўзровень майстэрства

***— Сяргей Галіевіч, у Дзень беларускага кіно, 17 снежня, на тэлеканале «Беларусь 3» адбудзецца прэм'ера вашага фільма, прысвечанага відэааператару, фотамастаку, пісьменніку Анатолю Забалоцкаму. Якая нас чакае гісторыя?***

— Гэта не толькі мая прэм'ера. Не буду раскрываць усіх таямніц, але скажу, што гісторыя нас чакае вельмі незвычайная. Фільм я пачаў здымаць гады два-тры таму. Анатоль Забалоцкі амаль штогод прыязджаў на Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш, дзе прэзентаваў свае фотаальбомы і кнігі. І неяк мне патэлефанавалі і папрасілі яго паздымаць. Я пагадзіўся, хоць і не ведаў, дзе потым спатрэбіцца той матэрыял, бо пра фільм не было яшчэ гаворкі і ў праграму ўзяць яго я не меў магчымасці. Паралельна якраз я працаваў над праграмай пра народнага мастака Беларусі Івана Міско. І на здымках з ім раптам даведаўся, што ён працуе над скульптурным партрэтам Анатоля Забалоцкага. Плюс аказалася, што яны яшчэ і сябравалі ў далёкія 60-я гады, жылі ў адной кватэры і іх многае звязвае. Таму Іван Міско вырашыў зрабіць скульптурны партрэт сябра проста ад шчырага сэрца. Мне тое вельмі спадабалася. Падумаў тады, што гэта можа стаць добрай нагодай для дакументальнага фільма. Пачаў паціху збіраць матэрыял пра іх абодвух. Паралельна фактычна працаваў над двума фільмамі. З Анатолем Дзмітрыевічам мы ладзілі здымкі ў Музеі кіно, на кінастудыі, у павільёнах. Хоць і былі некаторыя складанасці, але нам удалося разгаварыць нашага героя. Так матэрыялу станавілася ўсё больш, а вось часу да выхаду фільма заставалася ўсё менш. І я настолькі паглыбіўся ў матэрыял, што ўжо здавалася, быццам не магу быць аб'ектыўным і бясстрасным. Таму вырашыў далучыць да праекта ў якасці суаўтара і рэжысёра свайго таварыша, калегу Юрыя Цімафеева, які тады якраз быў вольны ад працы. Разам з ім мы з'ездзілі да Забалоцкага ў Маскву. Добры матэрыял адзнялі там, бо Анатоль Дзмітрыевіч вельмі актыўны, перажывае за сітуацыю ў свеце, у краіне, у кіно. Ён працягвае ствараць ілюстрацыі да кніг, а таксама мае вялікі фотаархіў. Мы з ім з'ездзілі на Ваганькаўскія могілкі, дзе Забалоцкі распавёў пра вядомых рэжысёраў, акцёраў, грамадскіх дзеячаў, з кім ён меў шчасце быць знаёмым і працаваць... І вось на завяршальнай стадыі працы над фільмам мы зразумелі, што вельмі складана вырашыць, што з сабранага матэрыялу ўвойдзе ў карціну, а ад чаго давядзецца адмовіцца. Аднак, я разумею, задача дакументальнага кіно — не распавесці біяграфію, а паказаць гледачу ўзровень аператарскага майстэрства, які быў у савецкім кіно ў такіх прафесіяналаў, як Забалоцкі. Нам хочацца пазнаёміць людзей з чалавекам, які жывы, працягвае сваю дзейнасць і так шмат зрабіў для кіно, у тым ліку і беларускага.

***— Мне імпануе ў вашых фільмах, наколькі тактоўна вы падыходзіце да раскрыцця тэм, герояў і разам з тым даяце гледачу стымул імкнуцца даведвацца яшчэ больш пасля ўбачанага. Скажыце, а чаму вучыцеся ў сваіх герояў?***

— Дакументальных фільмаў у мяне шмат і ўсе яны розныя. У асноўным пра дзеячаў кіно, як беларускіх, так і замежных. З самага пачатку я збіраўся паступаць ва УДІК, працуючы на мотавелазаводзе. Думаў пайсці на рэжысуру, але спачатку зрабіў спробу паступіць у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Рыхтавацца асабліва не было часу, вывучыў верш, байку і пайшоў здаваць экзамены, перавёўшыся на працы ў другую змену. Ні на што не спадзяваўся, аднак, на ўласнае здзіўленне, прайшоў. Гэта быў толькі другі набор на рэжысёраў тэлебачання. Так і застаўся вучыцца ў Мінску. І ніколькі пра тое не шкадую. Вучыўся, на трох работах працаваў, бо тады ўжо быў чалавекам сямейным і меў дзяцей. А вось калі прыйшоў на тэлебачанне, то свядома выбраў аддзел кінапраграм. Быў перакананы, што, здымаючы праграмы пра кіно, ездзячы на здымачныя пляцоўкі і размаўляючы з рэжысёрамі, і сам навучуся здымаць фільмы. Так вось ужо 40 гадоў працую на тэлебачанні, і ў кожнага чалавека спасцігаю майстэрства стварэць кіно. І так і не ведаю ўніверсальнага рэцэпта, бо кожны фільм патрабуе новага падыходу. Нельга навучыцца майстэрству ў іншых — можна спасцігнуць яго толькі на ўласным вопыце. Чытаць кнігі, глядзець чужыя працы — добра для натхнення і новых думак, высноў пра сябе і прафесію. А вось спазнаць яе можна толькі праз практыку. Хоць я гадоў 20 не падступаўся да кіно, а толькі распавядаў пра людзей, якія ствараюць яго. Пасля ж саспеў, каб і самому рабіць фільмы. Таму скажу так, што героі маіх фільмаў вучаць мяне любіць сваю прафесію.

## Кіно заўсёды здымаецца дзеля чагосьці

***— Ваш фільм «Вяртанне» — гісторыя не толькі пра ваеннага лётчыка, але і пра Радзіму, якая цана подзвігу, веры і наколькі важна захаваць памяць пра герояў. Таму хачу спытаць вас пра сучасныя рэаліі. Як супрацьстаяць таму, што сёння ў некаторых краінах разбураюць помнікі ВАВ і робіцца спробы перапісаць гісторыю?***

— Тое, што адбываецца зараз на Захадзе з помнікамі нашым воінам, якія вызвалілі Еўропу ад «карычневай чумы», гэта трагічная гісторыя ў іх гісторыі. Я разумею, чаму так адбываецца. Сышло пакаленне, якому па-сапраўднаму памяць тая была блізкай і балела. А цяпер некаторыя проста карыстаюцца сітуацыяй. Усё пачынаецца з дзяцінства, але вырасла пакаленне, якое не ведае вайны і якім яна патрабуе ахвяр, таму ім і не баліць. Помнікі ў парку для іх — толькі маўклівыя скульптуры. Аднак ёсць тыя, хто выхаваны па-іншаму і ўмее цаніць гісторыю. Я чалавек старой загартоўкі, які перакананы, што няма нічога лепшага за мір.

***— Адным з неад'емных элементаў вашых фільмаў з'яўляецца тэма веры, праваслаўя, з дапамогай чаго вы робіце важныя акцэнты. Наколькі гэта невыпадковая гісторыя і чым такія хады абумоўлены?***

— Справа ў тым, што я чалавек веруючы, хоць і не ўцаркаўлёны, таму душа патрабуе такіх выказванняў. Я перакананы, што кожнаму ўсё даецца па веры і па тым, што ён заслужыў. Сам пастаянна адчуваю, як Бог вядзе мяне, і сычтваю яго знакі. І, мабыць, раблю штосьці правільна, раз усё яшчэ жыву, працую і не губляю цікавасці да ўсяго. Плюс вялікі ўплыў на мяне таксама аказалі фестывалі праваслаўнага кіно, дзе я адчуваў, наколькі іх змест, людзі блізкія маёй унутранай сутнасці. Усё гэта выхоўвала мяне і не магло не знайсці адлюстравання ў маіх фільмах. Кіно заўсёды здымаецца дзеля чагосьці. Калі ты хочаш несці ў гэты свет мір, любоў, сэнсы праз сваіх герояў, то добра. А крытыкаваць касьці, корпацца ў нарывах чалавецтва — ужо зусім для іншага кіно, і такі падыход мне не блізкі. Я імкнуся да таго, каб пачуццём любові і веры быў прасякнуты змест маіх фільмаў. Безумоўна, разумею, што павінен прысутнічаць і канфлікт, драматургія. Але, нават заўважаючы недзе цёмныя бакі, трэба гаварыць пра іх з любоўю. Альбо ўвогуле лепш не прапускаць тое ў свет праз кіно. Таму я спрабую ў сваіх работах гаварыць пра любоў, творчасць, людзей, якія робяць вялікі ўклад у духоўнае развіццё грамадства, краіны і саміх сябе. Іншае мне нецікава.

***— Ёсць выраз «усяму свой час». Калі разглядаць у яго кантэксце дакументальнае кіно, то важна паспець выказацца тут і зараз альбо праз пэўны час, калі ўжо ўзважана кожнае слова?***

— І тое, і другое мае права на існаванне ў дакументальным кіно. Самае каштоўнае ў ім — не погляд мастака, а хранікальны матэрыял, праз які стваральнікі фільма адлюстроўваюць час. Тое, што здымаеш тут і зараз, праз сто гадоў будзе мець большую цану, чым усе каментарыі і рэжысёрскія погляды. Бо толькі час расстаўляе ўсё па сваіх месцах і робіць правільныя акцэнты. Усё, што я раблю, належыць Беларусі, незалежна ад таго, як і хто ацэньвае мае фільмы і праграмы. Адна з маіх місій — падняць існуючыя ў нас відэафонды і даць магчымасць гледачу згадаць тое, што было раней.

## Не змог бы адбыцца ў іншай краіне

***— «Самае дарагое — родныя людзі, а тэлебачанне і дакументальнае кіно даюць магчымасць рабіць тое, ад чаго атрымліваеш задавальненне» — вашы словы. Ці заўсёды так было і ці не шкадуеце, што, можа, упусцілі нешта?***

— Вядома, не без гэтага. Таму я і кажу ўсім пра тое, што трэба, нягледзячы на ўсю загружанасць на працы, больш часу аддаваць блізкім, дзецям, сябрам. Я, на жаль, часцей быў заняты працай. Але, дзякаваць богу, мне жонка заўсёды стварала надзейны тыл дома, клапацілася пра сям'ю і дзяцей. Я не лічу, што трэба вельмі апякаць дзяцей, але трэба ўдзяляць дастаткова ўвагі. Ім патрэбны не кантроль, а наша бацькоўская любоў. Я ж тады імкнуўся рабіць усё, каб мае дзеці маглі паўнавартасна творча развівацца, хоць і лавіў сябе на думцы, быццам перакладаю на педагогаў, трэнераў сваё ўзаемадзеянне з сынам і дачкой. Але нішто не можа замяніць бацькоўскую падтрымку і маміну любоў.

***— Як змянілася ваша ўспрыманне жыцця і творчасці, калі не стала сына?***

— Калі гэта адбылося, то я закрыў сваю праграму «Час кіно», бо больш не мог працаваць так інтэнсіўна. Хацеў увогуле сысці з тэлебачання і змяніць кардынальна жыццё. Вінаваціў сябе ў тым, што можа з-за працы прагледзеў сына. Але якраз праца і выратоўвала тады. Спатрэбіўся час, каб прыняць сітуацыю і навучыцца глядзець на яе па-філасофску. Да канца з такой стратай немагчыма змірыцца. Рана назаўсёды застаецца ў тваім сэрцы. І я штодня малюся за свайго сына, за бацькоў і за блізкіх сяброў. Кожны дзень прагжываю страту. Але цяпер я стаў больш уважлівы да тых, хто жывы, хто побач.

***— Тацяна Логінава ў вашым фільме «Санеты памяці...» кажа: «Калі б не было Рубінчыка, то я не адбылася б». А дзякуючы каму і чаму адбыліся ў прафесіі вы?***

— Я якраз нядаўна думаў пра гэта. Лічу, што я адбыўся дзякуючы выпадку, самому сабе і майму педагогу Віктару Рыгоравічу Карпілаву. Ён, мабыць, не павінен быў браць мяне на свой курс, бо я быў і перарасткам, і сямейным чалавекам, і падрыхтаваны не найлепшым чынам. Але ён даў мне шанц. І я да сёння як перад бацькамі, так і перад ім трымаю адказ за ўсё, што раблю ў прафесіі. Я, дарэчы, неяк даведаўся, чаму Віктар Рыгоравіч узяў мяне, і быў шчыра здзіўлены. Аказваецца, у часы Вялікай Айчыннай вайны падчас эвакуацыі яго сям'я апынулася ў Яраслаўлі, адкуль я родам. Там ім дапамаглі людзі. І вось, каб аддаць ім даніну павагі і ўдзячнасці, ён палічыў сваім абавязкам дапамагчы мне змяніць сваё жыццё.



***— Скажыце, за гады ў прафесіі, ездзячы ў камандзіроўкі, на фестывалі, з якім пачуццём вы кожны раз вяртаецеся ў Беларусь?***

— Я прыязджаю з адчуваннем, што вярнуўся дадому. За пяцьдзясят гадоў, якія пражыў у Беларусі, разумею: менавіта тут мая радзіма і нідзе больш я не хацеў бы жыць. Дзякуючы прафесіі, аб'ездзіў фактычна ўсю Расію і часта бываю ў Яраслаўлі, Санкт-Пецярбургу, Растове-на-Доне, дзе жывуць мае родзічы, і ў Маскве ў мяне ёсць сябры і знаёмыя, але доўга нідзе не магу затрымлівацца. Мяне цягне дадому. Тут у мяне ўсё. Хоць па маладосці лічыў сябе касмапалітам. Думаў, што магу жыць дзе заўгодна — толькі была б цікавая праца і камфорт. А сёння ўсведамляю, што не змог бы адбыцца ў іншай краіне, і за гэта ўдзячны роднаму тэлебачанню і Беларусі.

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва Сяргея КАЦЬЕРА.**

# Пра Віктара Турава, Залюстроўе і «Смолку»

**Калі гавораць пра беларускае кіно, звычайна закранаюць альбо класіку, гісторыю нацыянальнага кінематографа, альбо маладзёжныя эксперыменты. Рэжысёр Алена Турава звязвае абедзве тэмы сваёй асобай, сваёй творчасцю. Яна — дачка рэжысёра Віктара Турава, які праславіў беларускае кіно свамі шэдэўрамі і ад нядаўняга часу — мастацкі кіраўнік студыі маладзёжнага кіно «Смолк@» на «Беларусьфільме».**

## ВІКТАР ТУРАЎ І «Я РОДАМ З ДЗЯЦІНСТВА»

— Мой любімы фільм бацькі — «Я родам з дзяцінства». Фільм, можна сказаць, сямейны, там мая мама маладая здымалася. Яшчэ я вялікая аматарка творчасці Уладзіміра Высоцкага, чые песні там гучаць. Гэта першая вялікая работа Высоцкага на экране, бацька даў яму пуцёўку ў афіцыйны кінематограф. Але бацька ніколі не падкрэсліваў, не выстаўляў гэты факт, і ўвогуле сваім сяброўствам з Уладзімірам Высоцкім не хваліўся. А гэта было сапраўднае сяброўства, яны шмат сустракаліся, падарожнічалі, праводзілі час у кампаніях. Толькі бліжэй да свайго сыходу, у 1995-м, бацька даў вялікае інтэрв'ю пра Высоцкага. Акрамя таго, лічу, што гэты фільм пра хлопчыкаў пасляваеннага часу вельмі праўдзівы... Ім верыш. Бацька быў яшчэ малады, калі здымаў, у 1965 годзе, яшчэ былі для яго вельмі жывыя ўспаміны пра тое, як ён сам хлопчыкам быў з маці ў канцлагеры... Таму і атрымаўся такі шчыры аповед пра пасляваенных дзяцей. Для мяне гэты фільм самы блізкі, самы цёплы, хоць я з вялікай павагай стаўлюся да іншых работ бацькі, напрыклад, «Праз могілкі» — вельмі моцная карціна...

## ВІКТАР ТУРАЎ І КНІГІ

— Галоўным скарбам бацькі былі кнігі. Добрыя кнігі тады было купіць не так проста. Ён ездзіў па свеце ў камандзіроўкі і адусюль прывозіў рэдкія выданні. Меў вельмі шмат кніг пра музеі свету — тады ж не было інтэрнэту, паглядзець на якія-небудзь рэдкія ўзоры жывапісу, графікі. Шыкоўныя былі ў яго альбомы розных мастакоў, агромністыя тамы энцыклапедый, мастацкая літаратура... Увесь яго кабінет — спрэс сцяна кніг: ад падлогі да столі. Кніжкі бацька мне дарыў... Памятаю, падарыў «Алісу ў Залюстроўі» — таксама рэдкасць на той час... І, мне падаецца, гэта было невыпадковым, бо пасля я зняла фільм «Рыжык у Залюстроўі»... Так што ёсць нітачкі лёсу, якія цягнуцца з мінулага. Яшчэ бацька падарыў мне кнігу свайго сябра, паэта Шпалікава, па сцэнарыі якога зняты фільм «Я родам з дзяцінства». Шпалікаў, на жаль, вельмі рана сышоў з жыцця. І з-за гэтага, магчыма, не рэалізаваны праект, аб якім бацька марыў: фільм «Фіеста-45», да якога Шпалікаў мог бы напісаць сцэнарый. Пра 1945 год, пра вялікае, міжнароднае святкаванне Вялікай Перамогі. Гэта быў бы фільм пра тое, як хлопчык з маці, вызваленыя з германскага канцлагера, ідуць дадому праз усю Еўропу, параненую, хворую, якая аднаўляе свае сілы, але шчаслівую, якая верыць, што ўсё самае кепскае ўжо ззаду. Фільм пра тое, як людзі розных нацыянальнасцяў, вызваленыя ад фашызму, дапамагаюць адно аднаму. У аснове — рэальная гісторыя, як мой бацька з маленькай сястрой і маці, вызваленыя з нямецкага канцлагера, вярталіся пешкі ў Беларусь. Я вельмі б хацела, каб гэты праект быў калі-небудзь усё ж такі рэалізаваны, з захаваннем стылістыкі ранняга Турава, каб гэта ўспрымалася менавіта як яго апошні фільм.

## ХАРАКТАР РЭЖЫСЁРА

— Якім дакладна бацька быў на здымачнай пляцоўцы, не ведаю, бо я на пляцоўцы з ім не працавала. Магу толькі меркаваць па водгуках калег. Акцёры яго ўспамінаюць з вялікай цеплынёй і гавораць пра тое, што ў іх заўсёды быў вялікі «вотум даверу»: бацька дазваляў ім ствараць. Ставіў задачу, але чакаў, што акцёр прыўнясе ў ролю і сваё. Я сама на пляцоўцы чалавек не жорсткі, але быць зусім лаяльнай нельга, бо ўсё разваліцца... Зыходжу з таго, што кожны чалавек — космас: аднаму трэба дакладна даваць каманды, «рабіць адсюль і да абеду», з другім трэба акуратна... Падчас здымак у «Кіндэрвілейскім прывідзе» на двух хлопчыкаў-блізнят, якія выконвалі ролі гэткіх хуліганаў, давялося... крычаць. Па іх жа просьбе: «Мама як на нас пакрычыць — мы заўсёды ўсё робім». Пасля змены ў мяне быў сарваны голас, але хлопцы пачалі добра працаваць.



## ШЛЯХ НА ПЛЯЦОЎКУ

— Бацька аберагаў мяне ад працы ў кінематографе, лічыў, што гэта не для жанчыны. Упершыню на здымачную пляцоўку я трапіла, калі мяне запрасіў на эпізадычную ролю Дзмітрый Зайцаў — я была студэнткай БДУ... Тады пагдзела, як што адбываецца, і, папраўдзе, не думала, што сама буду на пляцоўцы некалі працаваць. І калі прыйшла на кінастудыю, гэта аказаліся анімацыйныя фільмы. Але жыццё само вырашыла... Калі майму дзіцяці было два-тры гады, мне прапанавалі паўдзельнічаць у стварэнні праекта пра Дзеда Мароза, што ён робіць улетку. Запрасілі як сцэнарыста, таму што я перад гэтым рабіла некалькі гадоў навагодні праграмы на тэлебачанні, і адна з іх, «Скарбонка навагодніх пацех», стала найлепшай праграмай года. Ідэя ўзнікла яшчэ і таму, што ў той год адкрылі ў Белавежскай пушчы рэзідэнцыю Дзеда Мароза. Цэха «камп'ютарных цудаў» тады на студыі яшчэ не існавала, я прапанавала інтэграваць анімацыйных персанажаў у наш фільм, як у стужцы «Хто падставіў трусіка Роджэра». І мяне ўзялі як сурэжысёра, рыхтаваць анімацыю. А рэжысёрам павінна была быць Рэната Грыцкова. Але ў Рэнаты па асабістых абставінах праца не склалася, яна з'ехала ў Ханты-Мансійск, на праект прыйшоў Іван Паўлаў. І фактычна мы з ім сталі сурэжысёрамі. Так я праходзіла сваю рэжысёрскую школу ў ігравым кіно. Успомніць смешна, як мы званілі і пыталіся, дзе набыць зялёную тканіну, на якой здымаюцца ўсялякія спецэфекты. «Вам храмакей патрэбны?» А мы і слова такога не ведаем... Фільм «Навагоднія прыгоды ў ліпені» аказаўся гэткай тэхналагічнай школай для ўсёй студыі, пачалі рабіць спецэфекты для самых розных карцін, не звяртаючыся па дапамогу да суседзяў.

## «СМОЛК@»

— Студыя ўзнікла не раптоўна. Ідэя ідзе ад Міністэрства культуры Беларусі і цалкам лагічна вынікае з таго, што беларускаму кінематографу патрэбная «свежая кроў», разнастайнасць у праектах. «Смолк@» — гэта і абрэвіятура: «Студыя маладзёжнага кіно», і наша электроная пошта, і гульня. «Сабачка» ў назве студыі, знак электроннай пошты, — наш талісман. Ён падтрымлівае і абараняе... Ён вельмі добразычлівы, але калі што, можа і гаўкнуць. Мэта студыі ў тым, што мы даём магчымасць маладым сцэнарыстам, рэжысёрам паспрабаваць сябе ў кіно, за бюджэтныя грошы. Мы тэсціруем іх на кароткім метры, каб выявіць патэнцыял. Калі нешта і не атрымалася, не значыць, што гэта канец творчай кар'еры, магчыма, чалавеку яшчэ трэба сябе «пракачаць». Калі ў кагосьці атрымалася добрая кароткаметражка, значыць, можна падключыць яго да больш сур'ёзнага праекта. Мы своеасаблівы фільтр, які вызначае таленты, знаходзіць будучых спецыялістаў. Мы не засяроджваемся толькі на студэнтах і выпускніках акадэміі мастацтваў ці інстытута культуры. Сёлета ў рамках фестывалю «Лістапад» быў упершыню праведзены конкурс — пітчынг рэжысёрскіх экспілікацый. Хлопцы і дзяўчаты з самых розных прафесій прапаноўвалі свае праекты на зададзеныя тэмы. У ігравым кіно тэмамі былі «Гарадская легенда» і «Першае каханне», у неігравым — «Мой родны кут». Да ўдзелу адабралі каля 20 канкурсантаў, было сур'ёзнае міжнароднае журы, прысутнічалі прадзюсары, у тым ліку з Расіі і іншых краін. Пераможцаў запрасілі ў нашу студыю ўдзельнічаць у рэалізацыі сваіх ідэй у кароткім метры. Цяпер рыхтуецца да запуску студэнцкі альманах на аснове работ пераможцаў пітчынгу. У нас зараз не вельмі вялікі калектыў, але спадзяюся, што разрасцёмся. Сёння ў нас працуе малады рэжысёр Кірыл Халецкі, выпускнік акадэміі мастацтваў, які зрабіў ужо некалькі цікавых работ, адзін з пераможцаў пітчынгу. Яго работа «Мне няма каго паклікаць на сваё пахаванне» ўвойдзе ў альманах маладых аўтараў. Разглядаем таксама магчымасць цягам наступнага года запусціць поўнаметражную камедыю «Кіношнікі» як дэбют Кірыла. Спадзяюся, падобныя пітчынгі паўтарацца, а мы будзем расказваць пра сябе ў іншых гарадах Беларусі. Зусім нядаўна былі на конкурсе аматарскага кіно імя Тарычa ў Полацку, прапанавалі ўдзельнікам даслаць свае творчыя прапановы. Плануем прэзентаваць сябе ў розных вузах, не толькі творчых: напрыклад, на філасофскім факультэце БДУ ёсць свой кінафестываль — хацелася б з імі скантактавацца. Калі кожны год дзякуючы нашай працы з'явіцца хаця б адно-два новыя імёны, ужо добры поспех.

**Лідзія АЛЯКСАНДРАВА.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-52817 (назначение – здание специализированное складов, хранилищ, наименование – здание склада), площадью 806,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28А.**

ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 423650100007001037 (назначение – для обслуживания здания склада), площадью 0,1290 га по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок расположен в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код – 13,4, площадью 0,0136 га.
Начальная цена продажи – 69 840 руб. (шестьдесят девять тысяч восемьсот сорок рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 6 984 руб. (шесть тысяч девятьсот восемьдесят четыре рубля)

Условия аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки объекта в размере 429,0 руб.;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца за составление выписки из регистрационной комиссии о правах (ограничениях и обременениях) прав на объект в размере 29,0 руб.;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3 % от конечной цены продажи объекта

Продавец – Открытое акционерное общество «Лидская обувная фабрика», 231300, Республика Беларусь, Гродненская обл., г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел. 8 (0154) 52-16-61

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 27 декабря 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/auktsionykopiya/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 29.09.2021 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18

**Последний день приема заявлений – 23 декабря 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «1-я Минская птицефабрика» (продавец) проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ГАРАЖА,**

**инв. № 601/С-33521, общей площадью 765,1 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623285790512000001 площадью 0,415 га *(право постоянного пользования)* по адресу: Минская область, Логойский район, Плещеницкий с/с, г. п. Плещеницы, ул. Воровского, 105 Б (далее – Объект).**

*Земельный участок имеет ограничения прав в использовании земель: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0180 га, специальная охрана (в зоне санитарной скважины № 20134/71), пл. 0,4150 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 38 880, 00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 3 888,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **17.01.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.01.2023** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017)516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (017) 504 83 58, 8 (029) 370 91 82.**

УНН 600068728

УНП 690699297

ООО «ИПМ-Консалт оценка»

информирует **об изменении начальной цены продажи имущества ООО «Термотехстрой»** (публикация извещения в газете «Звязда» от 10.12.2022 г.).

**Информацию читать как: «Начальная цена лота № 1 – казино составляет 896 080 долл. США. (1 150 долл. США за 1 кв. м с НДС)**

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42, www.ipmtorgi.by

# Правила проведения РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПОЛГОДА БЕЗ РАСХОДА!»

Настоящая рекламная игра называется «Полгода без расхода!» (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями Правил проведения Рекламной игры «Полгода без расхода!» (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания платы с участников Игры (далее – Участник, Участники).

**1. Сведения об организаторе**

**1.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

**1.2.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902.

**2. Территория проведения Игры** – Республика Беларусь.

**3. Период проведения Игры** – с 20.12.2022 по 14.04.2023, включая период розыгрыша и вручения призов.

**4. Состав комиссии по проведению Игры**

**4.1.** Председатель комиссии по проведению Игры (далее – комиссии) – Калитник Татьяна Алексеевна – индивидуальный предприниматель.

**4.2.** Члены комиссии:

**4.2.1.** Чернецова Анастасия Олеговна – индивидуальный предприниматель;

**4.2.2.** Горбачик Елена Степановна – главный специалист Управления продаж Департамента развития розничных продуктов ОАО «Белагропромбанк»;

**4.2.3.** Богдусевич Ирина Сергеевна – ведущий специалист ООО «Яскрава»;

**4.2.4.** Павлющик Инна Викторовна – индивидуальный предприниматель.

**5.** Игра проводится в целях стимулирования проведения физическими лицами безналичных платежей (далее – безналичные операции) с использованием принадлежащих им банковских платежных карточек «Драйв» международной платежной системы Visa, а именно Visa Classic MINI «Драйв», Visa Classic «Драйв», Visa Classic «Драйв» неперсонализированная (далее – Карточка «Драйв», Карточки «Драйв»), эмитированных ОАО «Белагропромбанк» (далее – Банк).

**5.1.** При использовании в Правилах термина **«банковская платежная карточка»** (далее – БПК) используется в значении, определенном статьей 45 Закона Республики Беларусь от 19.04.2022 № 164-З «О платежных системах и платежных услугах»: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к счету субъекта платежных правоотношений для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством».

**6. Участники Игры**

**6.1.** Участниками Игры могут быть физические лица, держатели Карточек «Драйв», эмитированных Банком, достигшие 18 лет – граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства.

**6.2.** Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии не могут быть Участниками Игры.

**7. Состав и размер призового фонда Игры**

*Таблица 1*

| № п/п | Наименование приза, участвующего в розыгрышах согласно п. 9.2 Правил | Наименование приза далее по тексту | Кол-во (шт.) | Сумма за 1 шт., бел. руб. | Сумма всего, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобильный видеорегистратор Navitel R300 GPS | Приз 1 | 10 | 211,20 | 2112,00 |
| | + денежные средства | | | 7,50 | 75,00 |
| 2 | Автомобильный компрессор Eco AE-028-2 | Приз 2 | 22 | 111,00 | 2442,00 |
| 3 | Универсальный набор инструментов WMC Tools 41082-5 | Приз 3 | 28 | 147,00 | 4116,00 |
| 4 | Портативная акустика Defender G70 / 65171 | Приз 4 | 30 | 124,08 | 3722,40 |
| 5 | Органайзер автомобильный Mid Ocean Brands Organizer / MO8880-03 | Приз 5 | 50 | 41,28 | 2064,00 |
| 6 | Портативный пылесос Kitfort KT-537-3 (белый/синий) | Приз 6 | 60 | 72,00 | 4320,00 |
| 7 | Подарочный сертификат РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка» номиналом 100 рублей в количестве 35 штук (срок действия до 30.09.23) | Главный приз | 1 | 3500,00 | 3500,00 |
| | + денежные средства | | | 498,93 | 498,93 |
| | **ИТОГО** | | | | **22 850,33** |

**7.1.** Призовой фонд Игры составляет 22 850,33 (двадцать две тысячи восемьсот пятьдесят) белорусских рублей 33 копейки и формируется за счет имущества и денежных средств Организатора.

**8. Условия участия в Игре**

Для участия в Игре необходимо:

**8.1.** В период с 00 часов 00 минут 20.12.2022 по 23 часа 59 минут 19.02.2023 включительно (далее – период участия):

**8.1.1.** Являться или стать держателем Карточки «Драйв», эмитированной Банком.

**8.1.2.** Зарегистрироваться на Сайте Игры drive-igra.by (далее – Сайт), заполнив следующие данные:

- фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) держателя Карточки «Драйв» (в соответствии с документом, удостоверяющим личность (для иностранных граждан, имеющих паспорт иностранного гражданина – в соответствии с переводом документа, удостоверяющего личность, на русский язык);
- дата рождения в формате «дд.мм.гггг»;
- номер мобильного телефона в формате «код мобильного оператора Республики Беларусь, номер абонента» (например: 29XXXXXXX, где 29 – код мобильного оператора, а XXXXXXX – номер абонента, без пробелов и символов).

Также необходимо подтвердить ознакомление с Правилами Игры и дать согласие на участие в Игре, а также согласие на обработку своих персональных данных в целях участия в Игре Организатору, поставив «галочки» в соответствующей форме; и дать согласие на получение СМС-уведомлений от Организатора Игры в рамках данной Игры.

После заполнения указанных данных получить посредством СМС-сообщения код для входа в личный кабинет на Сайте. Код для входа в личный кабинет, сообщаемый посредством СМС-сообщения, необходимо сохранить до окончания Игры.

Участник может зарегистрировать только один личный кабинет. В случае попытки регистрации одним Участником более одного личного кабинета, повторные данные не будут приниматься к участию в Игре.

**8.1.3**. Получить уведомление об успешной авторизации личного кабинета на Сайте (в личном кабинете раздел «Личная информация»).

В течение 14 календарных дней после создания личного кабинета Участнику автоматически будет направлено уведомление об успешной либо о неуспешной авторизации личного кабинета в виде сообщения на Сайте (в личном кабинете раздел «Личная информация»).

В случае если информация об Участнике не соответствует данным Банка, и Участник получил уведомление о неуспешной авторизации личного кабинета на Сайте (в личном кабинете раздел «Личная информация»), Участнику необходимо обратиться в любое подразделение Банка для обновления данных и последующей возможности авторизации личного кабинета. Срок обновления данных Банком – до 5 рабочих дней, следующих за днем обращения. Срок обновления данных на Сайте – до 14 календарных дней.

В случае если после успешной авторизации личного кабинета у Участника изменились любые из данных, указанных в п. 8.1.2 Правил, Участнику необходимо обратиться в любое подразделение Банка для обновления данных и уведомить Организатора об изменении данных по адресу электронной почты igra@yaskrava.by для синхронизации данных на Сайте и в Банке.

**8.1.4.** Совершить одну или несколько безналичных операций с использованием принадлежащей Участнику Карточки «Драйв», эмитированной Банком, либо ее реквизитов по оплате товаров/работ/услуг в организациях торговли (сервиса) на территории Республики Беларусь или в организациях торговли (сервиса), осуществляющих свою деятельность в глобальной компьютерной сети Интернет, на сумму не менее 35 (тридцати пяти) белорусских рублей 00 копеек каждая, за исключением операций, перечисленных в п. 8.2. Правил. В случае если безналичная операция совершена не в белорусских рублях, а в другой валюте, пересчет на белорусские рубли осуществляется по курсу, установленному Банком для проведения операций при использовании БПК на момент совершения безналичной операции.

**8.1.5.** Соблюдать правила пользования БПК.

**8.2.** Не являются основанием для участия в Игре следующие операции:

- операции по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;
- безналичные операции по переводу денежных средств с одной БПК на другую БПК;
- безналичные операции по оплате коммунальных услуг;
- безналичные операции по оплате налогов, штрафов и иных обязательных платежей;
- безналичные операции по размещению (пополнению) вкладов (депозитов), по оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;
- безналичные операции, совершенные посредством банкоматов, инфокиосков, платежных терминалов самообслуживания, мобильного интернет-банкинга, интернет-банкинга, в кассах подразделений банка, в почтовых отделениях (в том числе РУП «Белпочта») и в системе ЕРИП;
